ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 34-ы
№ 103 (2052)
24 снежня 1965 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР



Гэты здымак зроблен у цэху механічных коваўных прэсаў Мінскага трактарнага завода. Тут усё здзіўляе — багацце святла, паветра, а найбольш — навейшае, дасканалае абсталяванне. У новым годзе сучаснае аблічча будзе характэрным для многіх прадпрыемстваў рэспублікі. Бо, як гаварылася ў дакладзе намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР П. Л. Коханава на 7-й сесіі Вярхоўнага Савета Беларусі ў 1966 годзе «важнейшай задачай машына-будаўнічых прадпрыемстваў рэспублікі павінна стаць асваенне вытворчасці новых эканамічных і тэхнічна дасканалых машын і абсталяванняў».

Фота К. ПЯТРОВА.

З ПОГЛЯДАМ У ЗАЎТРА

Ідуць апошнія дні 1965 года. Сярод прыкмет, якія адрозніваюць сёлетнія навагоднія клопаты і размовы ад папярэдніх, ёсць адна найбольш яскравая—з апошнімі днямі года ідуць апошнія дні сямігодкі, слаўнага этапа ў гісторыі нашай краіны, у яе паступальнай хадзе да камунізма.

У ліку значных падзей гэтых апошніх дзён года — сёмая сесія Вярхоўнага Савета БССР шостага склікання, што адбылася 21—22 снежня. Народным выбраннікам, дэпутатам Вярхоўнага Савета, радасна было яшчэ раз пачуць на сесіі пра добрыя поспехі рэспублікі — дастаткова сказаць, што прамысловасць яе ўжо ў маі выканала заданні сямігодкі па агульнаму аб'ёму вытворчасці. Выпуск прамысловай прадукцыі ў 1965 годзе перавысіць узровень 1958 года ў два з лішнім разы. Сярэднегадовыя тэмпы яе прыросту за сямігодку складуць 11—12 працэнтаў пры заданні 8,8 працэнта. Звыш плана будзе выпушчана прамысловай прадукцыі на некалькі мільярдаў рублёў. Прадукцыйнасць працы ў прамысловасці вырасла прыкладна ў паўтара раза. За сямігоддзе ў рэспубліцы ўступіла ў строй каля 300 буйных прамысловых прадпрыемстваў і цэхаў.

Добры разгон, узяты ў гады сямігодкі, будзе захаваны і надалей. У дакладзе «Аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1966 год» намеснік Старшыні Савета Міністраў старшыня Дзяржплана БССР дэпутат П. Л. Коханаў разгарнуў перад дэпутатамі шырокую праграму ўздыму народнай гаспадаркі рэспублікі ў будучым годзе. У 1966 годзе нацыянальны даход у БССР у параўнанні з сёлетнім годам узрасце на 8,2 працэнта, валавая прадукцыя прамысловасці — на 8,3 працэнта, а ў параўнанні з планам гэтага года — на 11,8 працэнта, прычым 60 працэнтаў яго будзе атрымана за кошт росту прадукцыйнасці працы. Рэальныя даходы насельніцтва павялічацца на 7,8 працэнта.

Дакладчык падрабязна гаварыў аб перспектывах развіцця ў будучым годзе хімічнай і нафтавай прамысловасці, электрыфікацыі, машынабудавання і металаапрацоўкі, лёгкай, харчовай і іншых галін прамысловасці, сельскай гаспадаркі. Рубяжы, лічбы і паказчыкі, якія назваў дакладчык, сведчаць, што ў 1966 годзе рэспублікай будзе зроблен новы вялікі крок па шляху будаўніцтва камунізма.

Паспяховае выкананне гэтай праграмы,— адзначыў П. Л. Коханаў,— патрабуе павышэння ўзроўню гаспадарчага кіраўніцтва, ліквідацыі сур'ёзных недахопаў, якія ёсць у рабоце савецкіх і гаспадарчых органаў. Нам неабходна ўзмацніць барацьбу з рознымі стратамі, безгаспадарчасцю, за беражлівасць і эканомію дзяржаўных сродкаў і матэрыялаў. Мы павінны няспынна паляпшаць планаванне, павышаць узровень эканамічнай і фінансавай работы, умацоўваць дзяржаўную планавую дысцыпліну, узмацніць дапамогу прадпрыемствам у пытаннях укаранення новых метадаў планавання і эканамічнага стымулявання вытворчасці.

З дакладам аб Дзяржаўным бюджэце выступіў міністр фінансаў БССР Б. І. Шаціла. Праект Дзяржаўнага бюджэту рэспублікі на 1966 год, які ад імя Савета Міністраў быў прадстаўлены ім на разгляд сесіі, вызначаны ў 1.959,0 мільёна рублёў, што ў параўнанні з сёлетнім годам больш на 16,1 працэнта.

У спрэчках па дакладах прыняло ўдзел семнаццаць чалавек. План развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі і размеркаванне дзяржаўнага бюджэту на будучы год атрымалі поўнае ўхваленне і падтрымку ўсіх дэпутатаў. Разам з тым было ўнесена многа каштоўных прапаноў і заўваг, якія будуць улічаны Саветам Міністраў.

Вярхоўны Савет аднагалосна прыняў закон аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1966 год і зацвердзіў па артыкулах Закон «Аб Дзяржаўным бюджэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі на 1966 год».

З дакладам па трэцім пытанні парадку дня — зацвярджэнні ўказаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР выступіў сакратар Прэзідыума дэпутат Д. А. Лукашэвіч. Вярхоўны Савет аднагалосна прыняў законы і пастановы аб зацвярджэнні ўказаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, прынятых паміж сесіямі.

Далей Вярхоўны Савет у сувязі з пераўтварэннем органаў партыйна-дзяржаўнага кантролю ў органы народнага кантролю прыняў пастанову аб назначэнні Старшынёй камітэта народнага кантролю Беларускай ССР тав. Смірнова Аляксея Аляксеевіча з вызваленнем яго ад абавязкаў намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР.

У сувязі з пераходам старшыні пастаяннай камісіі па прамысловаму і жыллёваму будаўніцтву Вярхоўнага Савета БССР дэпутата М. П. Тарасава і намесніка старшыні гэтай камісіі дэпутата С. С. Батурына на новую работу Вярхоўны Савет аднагалосна выбраў старшынёй камісіі дэпутата П. П. Сабалеўскага і намеснікам старшыні дэпутата А. С. Ляхава.

Вярхоўны Савет таксама аднагалосна прыняў прапанову дэпутата П. М. Машэрава аб вызваленні В. Ф. Шаўры ад абавязкаў Старшыні Вярхоўнага Савета БССР у сувязі з яго просьбай, абумоўленай выбыццём за межы рэспублікі — пераходам на работу ў ЦК КПСС. На пасаду Старшыні Вярхоўнага Савета БССР дэпутаты аднагалосна выбралі тав. Скурко Яўгена Іванавіча (Максіма Танка).

ГАВОРЫЦЬ І ПАКАЗВАЕ БЕЛАРУСЬ

Васіль ДАНІЛЕВІЧ,

галоўны рэдактар мастацкага вяшчання Беларускага тэлебачання

Радыё...

Тэлебачанне...

Два вялікія цуды!

Напісаў гэта і тут жа яскрава адчуў пярэчанне радыёслухача. Радыё — цуд? Гэта ж так проста! Прыйшоў дадому. Уключыў радыёпрыёмнік. Пакруціў ручку — і галасы ўсіх радыёстанцый свету тут, побач.

Можа запярэчыць і тэлеглядач. Тэлевізар, маўляў, таксама штука простая. Тыя ж клавішы, ручкі. Уключыў, пакруціў, і на табе — канцэрт, спектакль, кіно. Сядзі, слухай, глядзі, колькі хочаш, чаго пажадае душа.

І праўда. Радыё і тэлебачанне (з тэхнічнага боку) сталі для нас рэчамі звычайнымі. Мы да іх паспелі прывыкнуць настолькі, што часам і забываемся на іх «шматступеньчатую» складанасць. А здзіўляе... здзіўляе нас, бадай, толькі тое, што ўзнікае на экране, або прыходзіць з голасам дыктара.

Ну, а калі звярнуцца да гісторыі?

Людзі майго пакалення, напэўна, помняць, як у нашы дамы прыйшло цуда— дэтэктарны прыёмнік з навушнікамі. Вакол маленькай чорнай скрынкі збіраўся народ. Адзін, прыпаўшы вухам да мембраны, настройваўся на хвалю. Другія, стаіўшы дыханне, з надзеяй глядзелі на яго. Ну? Ну? І раптам твар настройшчыка расплываўся ў лагоднай усмешцы: «Гаворыць!», «Як, пра што гаворыць? — пыталіся людзі. І гэты жывы інтарэс ужо тады падкрэсліваў грамадскі характар радыё.

Інакш і быць не магло. Выступаючы на Усерасійскім з'ездзе Саветаў, Ул. І. Ленін гаварыў: «Раней увесь розум чалавека, увесь яго геній тварыў толькі для таго, каб даць адным усе багацці тэхнікі і культуры, а другіх пазбавіць самага неабходнага — асветы і развіцця. Цяпер жа ўсе цуды тэхнікі, усе заваёвы культуры стануць агульнанародным здабыткам...» Заўважце, што размова ідзе не пра абстрактныя «цуды тэхнікі», а менавіта пра тыя, якія могуць служыць асвеце і развіццю працоўных мас.

З першага дня Кастрычніцкай рэвалюцыі радыё ў нашай краіне служыць народу. 7 лістапада 1917 года радыёстанцыя крэйсера «Аўрора» перадала зварот «Да грамадзян Расіі», напісаны Ул. І. Леніным. Праз пяць дзён па радыё прагучала паведамленне аб утварэнні Савецкага ўрада. Праз тыдзень Ул. І. Ленін зноў звярнуўся па радыё да генерала Духоніна, які знаходзіўся ў галоўнай стаўцы на фронце: «Неадкладна і фармальна прапанаваць перамір'е ўсім ваюючым бакам».

Так, крок за крокам, савецкае радыё сцвярджала сябе як цудадзейную зброю народа. 7 лістапада 1922 года Цэнтральнай Маскоўскай радыётэлефоннай станцыі была прысвоена назва «Радыёстанцыя імя Камінтэрна». Да яе голасу неўзабаве пачалі далучацца галасы радыёстанцый брацкіх рэспублік. Сорак гадоў назад у іх «хоры» загучаў і голас Беларускага радыё.

Сорак гадоў... Даўно адышла ў мінулае гаворачая «цуда-скрынка». Але са з'яўленнем яе, а пазней — радыёкропак, гучнагаварыцеляў і радыёпрыёмнікаў у вёсках і рабочых кварталах рэспублікі пачаўся цэлы пераварот. Перадачы Беларускага радыё ўкаранялі ў свядомасці шырокіх мас ленінскія ідэі аб пабудове сацыялізма. Людзі працы прыходзілі на радыё, каб праз «радыёгазету» перадаць сотням тысяч сваіх аднадумцаў вопыт напружанай барацьбы за новае жыццё. Мільёны працаўнікоў беларускай вёскі, раней, быццам сцяной, адгароджаныя ад усяго свету, далучаліся да літаратуры, мастацтва, культуры.

Вялікую ролю адыграла Беларускае радыё ў гады перадваенных пяцігодак і калектывізацыі сельскай гаспадаркі рэспублікі. Гэта былі гады бурлівага ўздыму эканомікі і росквіту культуры ў сацыялістычных умовах. Будаваліся першыя індустрыяльныя гіганты. Усталёўваўся калгасны лад. Дзеячы мастацтва і літаратуры стваралі яркія мастацкія палотны. Радыё трымала народ у курсе ўсіх гэтых падзей і гэтым самым дапамагала перамаганоснаму шэсцю новага.

Аднойчы загучаўшы ў эфіры, голас Беларускага радыё не змаўкаў ніколі. У гады Вялікай Айчыннай вайны праз Маскоўскую радыёстанцыю ён заклікаў нас да барацьбы з лютым ворагам. Самымі ганаровымі ўдзельнікамі радыёперадач былі ў тыя часы героі фронту і варожага тылу. А з якім захапленнем, калі ўдавалася натрапіць на хвалю, мы прыслухоўваліся паміж баямі да родных галасоў нашых паэтаў, музыкантаў, спевакоў!

Расказваюць пра такі выпадак. Неяк эскадрылля савецкіх знішчальнікаў, якая прыкрывала эшалон бамбардзіроўшчыкаў, вярталася з глыбокага фашысцкага тылу «дадому», на свой аэрадром. І раптам — варожыя самалёты. Што рабіць? Савецкім асам не да твару было ўхіляцца ад небяспекі. Пачаўся паветраны бой. Ён быў кароткі, але грозны. Адзін з нашых пілотаў, захапіўшыся пагоняй за варожым сцярвятнікам і збіўшы яго, не знайшоў у небе сяброў. Справа ўскладнялася яшчэ і тым, што не працаваў аэракомпас. Дзе ўсход, дзе захад — невядома. Пілот павярнуў ручку радыёпрыёмніка і — якая радасць! — у эфіры загучала мелодыя беларускай народнай песні «Перапёлачка». Так голас роднай зямлі, быццам маяк, і прывёў лётчыка да сваіх.

Мне давялося быць удзельнікам аднаўлення савецкага радыёвяшчання ў вызваленых раёнах Беларусі. Успамінаецца такі выпадак. Аднаму з радыёжурналістаў далі заданне — адшукаць у Гомелі вядомага дзеда Талаша і запрасіць яго ў радыёкамітэт, які размяшчаўся ў той час у Нова-Беліцы. Журналіст знайшоў стогадовага дзеда, перадаў яму просьбу свайго кіраўніцтва

— Нікуды я не пайду, — адрэзаў вядомы партызан. — Шмат спраў. Ды і на тое, каб мне хадзіць да вас, патрэбен высокі дазвол.

Журналіст разэлаваўся:

— А, так! Ну і не трэба! Абыдземся без цябе, дарагі дзед! Знойдуцца людзі, каб сказаць добрае слова тым, хто яшчэ стогне пад фашысцкім ярмом.

— Ты што? Як гэта без мяне?! —разбушаваўся дзед. — Я вам пакажу — без мяне! Ты чаму адразу не сказаў, на што запрашаеш?! Пойдзем...

А праз гадзіну—другую дзед Талаш гаварыў прамову па радыё:

— Сыны мае! Дочкі мае! Біце насмерць фашысцкіх гадаў! Не сёння — заўтра мы будзем разам святкаваць перамогу. Трымайцеся! Мы ідзём. Перамога, свабода з намі! Гэта кажу вам я, дзед Талаш, родныя мае.

А пасля тыя, каму давялося слухаць гэтае выступленне, расказвалі пра вялікае ўражанне, якое зрабіў на іх дзед Талаш, герой грамадзянскай і Айчыннай войнаў.

У пасляваенныя гады Беларускае радыё зрабіла вялікі крок уперад. Цяпер у Мінску, на вуліцы Краснай, узвышаецца новы «Дом радыё», студыі і апаратныя якога забяспечаны першакласнай тэхнікай. Вырас калектыў. Прыдбаны багаты творчы вопыт. Знойдзена нямала цікавых форм радыёвяшчання. Не пакінуты без увагі ні рабочыя і калгаснікі, ні вучоныя і тэхнікі, ні дзеячы мастацтва і літаратуры, ні моладзь і дзеці.

Штодзённыя праграмы Беларускага радыё складаюцца з перадач лекторыя «Ленінскі універсітэт мільёнаў», грамадскіх рэдакцый «Рабочай радыёгазеты» і «Аўтатранспартніка», радыёстанцыі «Сельскае жыццё», «Юнацтва», «Арляняты» і г. д. Улік характару пэўнай аўдыторыі, гэтак жа як і дакладна выдзелены час для перадач, стварае ўмовы для больш глыбокай творчасці і больш актыўнай работы з аўтарамі.

Вялікае месца ў вяшчанні займаюць перадачы мастацкія. Разнастайныя перадачы літаратурна-драматычнай рэдакцыі. Тут і спектаклі, якія трансліруюцца непасрэдна з тэатра, і радыёспектаклі па інсцэніроўках твораў беларускіх празаікаў, і выступленні саміх пісьменнікаў, і перадачы аб новых кнігах. Даволі цесную сувязь падтрымлівае з тэатрамі, мастацкімі калектывамі, кампазітарамі і выканаўцамі музычная рэдакцыя. Яна мае багаты фонд радыёзапісаў. Гэта дае ёй магчымасць складаць шырокія праграмы, якія ўключаюць як творы вялікай музычнай спадчыны, так і лепшыя дасягненні сучаснай музычнай культуры.

Поспехі відавочныя. Але чым багацейшы становіцца вопыт, тым больш узнікае праблем. Шмат яшчэ фармалізму, дэкларатыўнасці ў перадачах прапагандысцкага напрамку. Падчас у эфіры гучаць напісаныя шэрай, казённай мовай нарысы пра героя працы. Глыбокія гутаркі на эканамічныя тэмы яшчэ падмяняюцца статыстычнымі галаваломкамі.

Мастацкае вяшчанне мае свае недахопы. Выдатны папулярызатар думак Леніна пра ролю радыё ў эстэтычным выхаванні народа Н. К. Крупская гаварыла, што «мэта мастацкага радыёвяшчання — не толькі задавальненне запатрабаванняў слухача, але таксама і акультурванне мастацкіх густаў масавага слухача». Іменна апошняга часам і не хапае мастацкім праграмам. Мала яшчэ перадач з выхаваўчым ухілам.

Разам з тым, што б мы ні гаварылі пра недахопы радыёвяшчання, радыё ўсё ж застаецца вялікім цудам сучаснасці.

Ну, а тэлебачанне?

Успомнім... Дзесяць гадоў назад Беларускае тэлебачанне ўпершыню пачало свае перадачы. Іх глядзелі толькі ў Мінску і ў блізкіх да яго населеных пунктах. А цяпер тры чвэрці насельніцтва рэспублікі можа прымаць не толькі «сваю» праграму, але і перадачы Цэнтральнага тэлебачання. Больш таго, тэлевізійныя магістралі даўно ўжо звязалі нашу сталіцу з сістэмай «Інтэрбачання». А нядаўна Беларуская тэлестудыя вяла праз спадарожнік «Маланка-1» перадачу з Брэста на Уладзівасток. На Уладзівасток! Такое пашырэнне тэлевізійнага фронту — факт проста неверагодны.

Яркім феерверкам празіхацеў на тэлеэкранах краіны выпуск «Эстафеты навін», прысвечаны 20-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па колькасці выдатных людзей, што прынялі ў ім удзел, па калейдаскопу паказаных падзей, па мастацкаму афармленню і па выразнасці перадачы ў эфір гэты выпуск «Навін» і сёння яшчэ застаецца непераўзыдзеным. Шматлікія пісьмы з усіх канцоў краіны сведчаць пра вялікую папулярнасць беларускіх «Блакітных агеньчыкаў». Грамадскасць цёпла сустрэла тэлевізійныя спектаклі апошніх гадоў: «Трэцяе пакаленне» — паводле К. Чорнага, «Сэрца на далоні» — па І. Шамякіну, «Людзі на балоце» — па І. Мележу. Цікавымі, вясёлымі былі перадачы тэлевізійнага маладзёжнага клуба «Сняжынка». Добрага слова заслугоўваюць перадачы-канцэрты «Вечар балета», «Харэаграфічныя мініяцюры», «Беларуская лірычная», якія перадаваліся на «Інтэрбачанне».

Удач было шмат, пра ўсе тут не раскажаш. Але яшчэ пра адну вялікую ўдачу не сказаць нельга. Гаворка ідзе пра тэлевізійны мастацкі фільм «Зімовы дуб». Гэты фільм заваяваў тры міжнародныя прызы: «Залатую німфу» —у Монтэ-Карла, «Хлопчыка з паўмесяцам»—у Мюнхене і «Крыштальны маяк» — у Празе.

Безумоўна, на Беларускім тэлебачанні, як і на радыё, існуе яшчэ шмат нявырашаных праблем, недахопаў. Адзін з іх — малая колькасць новых жанраў і форм перадач. Трэба сказаць і пра недасканаласць многіх сцэнарыяў, пра нецікавае рэжысёрскае вырашэнне некаторых перадач, пра безгустоўнае мастацкае афармленне і г. д.

Набліжаюцца дзве вялікія даты — 50-годдзе Савецкай улады і 100-годдзе з дня нараджэння Ул. І. Леніна. Абавязак і гонар Беларускага радыё і тэлебачання — прыйсці да гэтых гадавін сапраўды вялікім цудам нашай сучаснасці.

У народных ТЭАТРАХ

Мастацкаму кіраўніку народнай оперн студыі Палаца культуры прафсаюзаў народнаму артысту БССР і заслужанаму артысту Армянскай ССР Мікалаю Мікалаевічу Сярдобаву споўнілася 60 год. Гэтая дата супала з 35-годдзем творчай дзейнасці артыста.

У Палацы культуры адбыўся вечар, прысвечаны юбіляру. Павіншаваць аднаго са старэйшых майстроў сцэны сабраліся артысты, рабочыя і служачыя, аматары самадзейнага мастацтва сталіцы. Затым удзельнікі народнай оперн студыі паказалі прысутным 4-ы акт з оперы «Кастусь Каліноўскі» Д. Лукаса ў пастаноўцы М. Сярдобава.

На здымку — сцэна з 4-га акта.

Фота Э. ТРАГУБОВІЧА і В. МАНЬКО.

Мінск Як правесці рэпетыцыю, якія памылкі часцей за ўсё дапускаюць рэжысёры народных тэатраў?—такое пытанне хвалявала аматараў сцэны аўтамабільнага завода. Каб дапамагчы артыстам і рэжысёрам, гарадскі Дом мастацкай самадзейнасці вырашыў правесці паказальныя заняткі. У Палац культуры аўтазаводцаў былі запрошаны артысты і кіраўнікі народнага тэатра трактарнага завода, Маладзечанскага народнага тэатра, рэжысёры драматычных калектываў вобласці. Прысутным была паказана сцэна са спектакля «Лес» А. Астроўскага. Затым разгляд гэтай сцэны зрабіў рэжысёр Маскоўскага тэатра імя Ярмолавай А. Шатрын.

Пінск Рэжысёр І. Сакольскі паведаміў нашаму карэспандэнту:

— На працягу дваццаці дзён у нас павінны адбыцца тры прэм'еры. Гэта «Цудоўны сплаў» Ул. Кіршона, «Веру ў цябе» В. Карастылёва і вечар беларускіх вадэвіляў: «Прымакі» па п'есе Я. Купалы і «Збянтэжаны Саўка» (у апрацоўцы М. Троіцкай). У прэм'ерах выступяць артысты народнага тэатра М. Літвіновіч, Т. Сівохіна, А. Міхайлава, А. Кабадзейцава, Л. Санабровіч, А. Гаран і іншыя. Дэкарацыі аформіў самадзейны мастак Р. Бойка. Новыя спектаклі будуць паказаны не толькі жыхарам горада. Некаторыя з іх убачаць працаўнікі палёў.

Гомель Аб барацьбе за годнасць савецкага чалавека, за давер да яго расказка гледачам новая работа народнага тэатра Палаца культуры імя Ул. І. Леніна—спектакль «Адыходзячыя цені» А. Сафронава. Прэм'ера яго павінна адбыцца 9 студзеня. Цяпер ідуць напружаныя рэпетыцыі. Для выпускніка рэжысёрскага аддзялення Ленінградскай вышэйшай школы прафсаюзаў Г. Пікоўскага, які сам у мінулым быў артыстам гэтага тэатра, спектакль з'яўляецца дыпломнай работай.

У гэтым годзе ў тэатры паявіўся свой спадарожнік—студыя, у якой займаецца каля 30 маладых гамяльчан. Студыйцы рыхтуюць свой спектакль «Да пабачэння, хлопчыкі!». Пастаноўку яго ажыццяўляе на грамадскіх асновах рэжысёр Д. Хает. Вялікую дапамогу ў музычным афармленні аказвае канцэртмайстар Палаца культуры В. Палякова.

Афармленне спектакляў робіць мастак Г. Гера.

Іванава Аматары самадзейнай сцэны раённага цэнтра днямі былі прыемна ўзрадаваны—іх запрасілі на прэм'еру спектакля «Мой бедны Марат» па п'есе А. Арбузава, які падрыхтавалі артысты раённага Дома культуры. У спектаклі паспяхова выканалі ролі настаўніца С. Арцюшэўская, інструктар РДК А. Ліхота, служачы М. Цімошчанка і інш.

Орша Застольныя рэпетыцыі п'есы «Чалавек з ружжом» М. Пагодзіна пачаліся ў тэатры ільнокамбіната. Роля Ул. І. Леніна даручана артысту народнага тэатра Б. Арлову.

У ГОНАР М. А. ШОЛАХАВА

22 снежня сакратарыят праўлення Саюза пісьменнікаў СССР наладзіў прыём у гонар лаўрэата Нобелеўскай прэміі М. А. Шолахава.

У ліку гасцей у Доме прыёмаў былі пісьменнікі, паэты, драматургі, крытыкі, дзеячы навукі, майстры мастацтваў, прадстаўнікі грамадскасці, а таксама савецкія і замежныя журналісты.

Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР М. С. Ціханаў у сваёй прамове падкрэсліў, што Міхаіл Шолахаў з'яўляецца сапраўды народным пісьменнікам, яго кнігі—гэта гонар савецкай літаратуры, выдатныя дакументы нашай эпохі.

Пісьменнікі С. В. Міхалкоў, П. У. Броўка, Сабіт Муканаў, кінарэжысёр народны артыст СССР С. Ф. Бандарчук, міністр культуры СССР К. А. Фурцава, мангольскі пісьменнік, перакладчык «Ціхага Дона» на мангольскую мову Базарын Дашцарэн і выканаўца ролі Рыгора Мелехава ў фільме «Ціхі Дон» П. П. Глебаў звярнуліся да Шолахава з цёплымі словамі прывітання.

М. А. Шолахаў сардэчна падзякаваў Саюзу пісьменнікаў, які наладзіў гэту сустрэчу, а таксама ўсім прысутным на вечары.

Прыём прайшоў у цёплай, сардэчнай абстаноўцы.

ТАСС.

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ЖУРНАЛІСТАЎ СССР

На працягу двух дзён праходзіў VI пленум праўлення Саюза журналістаў СССР. У яго рабоце прынялі ўдзел рэдактары цэнтральных, рэспубліканскіх і краявых газет, кіраўнікі факультэтаў і кафедраў журналістыкі, прадстаўнікі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР.

З дакладам па першаму пытанню—«Аб задачах савецкіх журналістаў у сувязі з падрыхтоўкай да XXIII з'езда КПСС» выступіў сакратар праўлення Саюза журналістаў СССР, генеральны дырэктар ТАСС Д. П. Гаруноў.

З дакладам аб падрыхтоўцы журналісцкіх кадраў ва універсітэтах краіны выступіла член рэдкалегіі газеты «Известия» Л. М. Іванова.

У рэзалюцыі, прынятай пленумам адзначаецца, што цяпер, калі наша краіна ідзе насустрач XXIII з'езду партыі, галоўная і адказнейшая задача савецкіх журналістаў—умела і шырока паказваць падрыхтоўку да гэтай важнейшай падзеі ў жыцці камуністаў, усіх савецкіх людзей.

ТАСС.

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР за заслугі ў развіцці прафесіянальнага і самадзейнага музычнага мастацтва і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння народны артыст БССР Мікалай Мікалаевіч Сярдобаў узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

НА РОЗНЫХ ХВАЛЯХ

Гомельская студыя тэлебачання разам з Беларускай дзяржаўнай філармоніяй ведзе новы цыкл перадач пад назвай «Музычны лекторый». У лекцыях-канцэртах расказваецца аб песнях і інструментальнай музыцы, беларускай оперы і балеце. Адбудуцца творчыя сустрэчы з дзеячамі мастацтва рэспублікі.

У перадачы «Беларуская музычная культура», якая адбылася днямі, удзельнічалі мастак-музыказнаўца І. Зубрыч, салісты Белдзяржфілармоніі заслужаныя артысты БССР А. Астрамецкі і Т. Пастуніна, артысты Л. Шубіна, Д. Зубрыч, А. Стэрлін.

На здымку — Л. Шубіна выконвае песню Алесі з оперы Цінокага «Дзяўчына з Палесся». Каля раяля А. Стэрлін.

Фота Ул. ПРАТАПОПАВА.

ПА ЧАТЫРОХ ПРАГРАМАХ

«Беларуская маладзёжная», «Сельскае жыццё», «Рабочая газета», «Юныя ленінцы», «Для веруючых і няверуючых» — гэтыя назвы перадач добра знаёмы многім радыёслухачам. Зараз рэспубліканскае радыё вядзе свае перадачы па чатырох праграмах — на доўгіх, сярэдніх, кароткіх і ультракароткіх хвалях. Агульны аб'ём вяшчання займае 15 з палавінай гадзін у суткі.

З новага, 1966 года, час вяшчання складзе 18 гадзін у суткі.

ВЕЖЫ НАД ПАЛЯМІ

Нядаўна ў Слоніме ўведзена ў эксплуатацыю рэтрансляцыйная тэлевізійная станцыя. Яна дала магчымасць ва ўсіх раёнах Гродзенскай і большай часткі Брэсцкай абласцей глядзець тэлевізійныя перадачы.

Цяпер у Беларусі дзейнічаюць чатыры тэлецэнтры і дзесяць рэтрансляцыйных станцый. Тэлебачаннем ахоплена амаль 75 працэнтаў насельніцтва рэспублікі.

У бліжэйшыя гады будзе праведзена рэканструкцыя Мінскага тэлецэнтра, што дазволіць значна павялічыць радыус яго дзеяння. Тэлевізійныя рэтранслятары будуць пабудаваны ў такіх аддаленых раёнах, як Капаткевічы і Ушачы.

2 МІЛЬЁНЫ РАДЫЁПРЫЁМНІКАЎ

Радыё... Тэлевізар... Гэтыя словы зараз зразумелыя ўсім. Але мала хто ведае, што пачатак радыё ў рэспубліцы быў пакладзены ў 1925 годзе. Тады ў Мінску адбылося ўрачыстае адкрыццё шырокавяшчальнай радыётэлефоннай станцыі. Яна магла трансліраваць свае перадачы толькі ў радыусе 300 вёрст. У той час у Мінску налічвалася ўсяго... 20 радыёпрыёмнікаў і каля 400 радыёкропак.

Цяпер у нашай рэспубліцы звыш двух мільёнаў радыёпрыёмнікаў і радыёкропак і амаль трыста тысяч тэлевізараў.

З БРАТНІХ РЭСПУБЛІК

«Спяваюць рускія народныя хоры», «Канцэрт ансамбля песні і танца Літоўскай ССР», «Песні Башкірыі», «Выконвае чувашская спявачка Лідзія Раманенка»...—гэта перадачы, з якімі пазнаёміліся за апошні час беларускія радыёслухачы. Расказы пра майстроў мастацтва, пра росквіт культуры братніх рэспублік — Грузіі, Малдавіі, Таджыкістана, Украіны — сталі традыцыйнымі і на блакітных экранах. Нядаўна тэлегледачы прагледзелі канцэрты «Спявае Муслім Магамаеў», «Песні і рамансы на словы Мусы Джаліля», «Народны артыст СССР С. Бандарчук» і інш.

Вельмі часта трансліруюць радыё і тэлестудыі братніх рэспублік перадачы пра жыццё Беларусі. З новымі спектаклямі беларускіх тэатраў рэгулярна знаёмяцца ўкраінцы, літоўцы, латышы. Вялікую літаратурную перадачу, складзеную з твораў нашых паэтаў і празаікаў, трансліравала Смаленскае радыё.

ТЭАТР

ЧАТЫРЫ ВАРЫЯНТЫ „ЧАТЫРОХ КРЫЖОЎ“

«Віншую мужны калектыў з ажыццяўленнем пастаноўкі цяжкай п'есы»— тэлеграфаваў у дзень першага спектакля па сваёй п'есе Брэсцкаму тэатру імя ЛКСМБ Анатоль Дзялендзік. Ён абяцаў неўзабаве прыехаць на спектакль, а ў гэты дзень ішла прэм'ера тае ж п'есы ў Віцебску, і аўтар быў там.

Адначасова п'есу ставяць на сцэне Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Распачынаюць пастаноўку ў Гомелі. І як не радавацца такому трыумфальнаму дэбюту ў драматургіі: першая п'еса ўвайшла ў рэпертуар адразу чатырох тэатраў.

Аднак тэлеграма, якую Дзялендзік прыслаў у Брэст, не была гульнёй у сціпласць. Ён ужо меў падставы лічыць свой твор нялёгкім для пастаноўкі і разумеў, што калектыву спатрэбілася нямала сіл, каб давесці справу да прэм'еры.

П'еса «Чатыры крыжы» — аб мужнасці вялікага кахання, сіле дружбы, трываласці духоўнага яднання. У аснове сюжэта выключны факт: чалавек, асуджаны на смерць, перамагае няўмольную хваробу, супраць якой навука пакуль што не знайшла надзейных сродкаў барацьбы. Цуд? Бадай што так. І аўтар прымушае нас паверыць, бо мы пазналі творцаў гэтага цуду — сяброў хворай. Яны змагаліся за тое, каб лічаныя дні і месяцы яе жыцця не сталі часам чакання смерці. Смерць — адступіла.

Ці верагодна гэта?

...Дзялендзіка аднойчы выклікалі ў Віцебск і запатрабавалі:

— Інга павінна памерці.

Тэатр даводзіў, што інакш у п'есе не зводзяцца канцы з канцамі, што, калі аўтар будзе праяўляць упартасць, давядзецца перанесці тэрміны прэм'еры. А да яе заставаўся тыдзень, калі не менш. Яму тлумачылі: «луноўка»—рэч канкрэтная, яе пакуль што нікому не ўдавалася перамагчы. Хай Інга памірае. Маўляў, не ў гэтым справа. Галоўнае, што яе смерць дапамагае іншым стаць больш чыстымі і стойкімі і г. д. І аўтар, павагаўшыся, згадзіўся. Урач па спецыяльнасці, ён даў драматургічнае пасведчанне аб смерці гераіні.

Аднак знайшліся людзі па-за п'есай, якія разам з персанажамі Дзялендзіка выступілі за ўваскрашэнне Інгі, за яе жыццё. Яны даводзілі не менш пераканаўча, што смерць Інгі разбурае задуму п'есы і пярэчыць яе ідэі. Аўтар зноў быў вымушан прыехаць да неспакойнай пацыенткі. Яго «дзяжурства» было не з лёгкіх. На адным дні Інга то памірала (на ранішняй рэпетыцыі), то ўваскрасала (на вячэрняй). Было ясна: акрамя названай аўтарам хваробы ў п'есе існуе і нейкая другая, якую ў тэатры не ўбачылі своечасова, пры запуску п'есы ў вытворчасць, а цяпер спяшаюцца пры дапамозе хірургічных сродкаў пазбавіцца яе.

А вось што адбывалася ў Брэсцкім тэатры імя ЛКСМБ. Трывожныя сімптомы тут выявіліся прыблізна дзён за дваццаць да прызначанай прэм'еры. На дапамогу маладому рэжысёру Ул. Серафімовічу, прыйшоў галоўны рэжысёр тэатра Г. Волкаў. І не ў якасці адважнага хірурга, а як уважлівы і чулы тэрапеўт. Каб вырашыць лёс Інгі, ён вывучаў не толькі яе сэрца, а і ўслухоўваўся ў біццё пульсу кожнага з людзей, якія жывуць у п'есе.

У Віцебску (мне давялося там быць на адной з генеральных рэпетыцый) шукалі абгрунтавання смерці Інгі. У Брэсце ж, наадварот, тэатр скіраваў свой пошук (мяркую па прэм'еры) на выяўленне ўпартай жыццядзольнасці гераіні і мужнасці яе сяброў. І гэта зусім не азначае, што брастаўчане нібыта аблягчаюць драматызм самой жыццёвай сітуацыі, закладзенай у п'есе. Наадварот, тэатр у радзе сцэн паглыбіў псіхалагічную насычанасць падзей. Вельмі паказальныя падтэксты дыялогу паміж Інгай (Н. Ганчарэнка) і Аскольдам (А. Бераржной) у карціне першай. Аскольд на запытанне Інгі аб выніку аналізу яе крыві адказвае, што ў дзяўчыны няма падстаў для хвалявання. Апроч таго, ён, закаханы ў Інгу, пачынае раптам выкладаць ёй сваю жыццёвую праграму: каб у навуцы чагосьці дасягнуць, трэба працаваць па васемнаццаць—дваццаць гадзін у суткі, таму — «Мне нельга абзаводзіцца сям'ёй». Усё гэта Інга — Н. Ганчарэнка выслухала ўважліва, з цікаўнасцю. І на развітанне супакоіла:

— Аскольд, тое, што ты робіш, — святая справа. І калі ты лічыш, што нехта можа перашкодзіць... Толькі фанатыкі і дамагаюцца сапраўднага поспеху.

Так супакойваюць жанчыны слабых мужчын, здымаючы з іх цяжкую ношу. Інга — Ганчарэнка з нейкім шкадаваннем, з сумам ледзь улоўна дакранулася да рукі Аскольда. Паспешліва зірнула ў яго вочы, нібыта зразумеўшы штосьці. Што?! Гэтае пытанне будзе потым пастаянна праследаваць нас да таго часу, пакуль сама Інга не раскажа, што яна даўно жыве ў трывожным чаканні свайго лёсу, што яе сяброўкі, якім з ёй давялося перанесці ў дзяцінстве варварскія доследы фашысцкіх урачоў, памерлі ўжо. Аказваецца, Інга **здагадалася**, што ў аналізе ёсць штосьці, аб чым Аскольд утойвае. Яе трывожную здагадку Аскольд толькі пацвердзіў сваімі разважаннямі аб адрачэнні ад любві ў імя высокіх мэт. І Інга не стала дамагацца праўды, каб захаваць кавалачак надзеі. У яе хапіла мужнасці, каб супакоіць Аскольда, пазбавіўшы яго абавязку быць з ёй, падтрымліваць яе. Аднак працягваць размову ў Інгі не было сілы... Таму яна так спешна пайшла адгэтуль.

Наколькі ж ускладняецца наступнае жыццё Інгі пасля такой трактоўкі першай сцэны!..

У аўтара яна знаёміцца з Вадзімам, жартуе з ім і сварыцца, пакуль што не падазраючы аб сваёй хваробе. На сцэне — жыве, змагаючыся супраць сваёй трывогі, падазрэнняў, прадчуванняў. У яе вуснах набывае асаблівы сэнс пікіроўка з пакуль што незнаёмым хлопцам — Вадзімам:

— Якое можа быць каханне ў век электронікі, нейрахірургіі... — кідае дзяўчына.

У аўтара гэта напісана як раздражнены выклік, як модная брава да «ультрасучаснасцю». На сцэне ж Інга гэтай фразай вывярае праз рэакцыю Вадзіма тое, што меў на ўвазе Аскольд. Што кіравала ім у разважаннях аб непатрэбнасці любві? Ці можна цалкам прысвяціць сябе ідэі?

І вось адказ Вадзіма:

— Пустацветы гінуць.

Напэўна, сам Дзялендзік не ўяўляў, наколькі гэта ўразіць яго Інгу, як умацуе ў гэты момант яе веру, як вызначыць далейшыя адносіны з Вадзімам. У гэтай фразе — абавязак і права Інгі на жыццё. І ў гэтай фразе — права гераіні на наступную карціну, дзе адбываецца дзівоснае яе прызнанне ў любві Вадзіму.

Тут мы павінны сказаць і пра партнёра Н. Ганчарэнкі — С. Яўдошанку. Яго Вадзім — цікавая натура з вострым, незалежным розумам. Натуральна, лёгка ён пераходзіць ад высокіх слоў да скепсісу і нават, упадаючы ў цынізм, умее быць прывабным. Гэта — прывабнасць інтэлекту, сілы духу і адчування фізічнай радасці жыцця. Пабіўшыся аб заклад, што «закахае» ў сябе Інгу, ён гэта робіць з грубаватай грацыёзнасцю, гулліва, дзёрзка. Н. Ганчарэнка — Інга бачыць і разумее ўсё. Што ж яе прымусіла заплюшчыць вочы і згадзіцца на пацалунак? Бываюць рэчы, на якія няма адказу, і ў гэтым — ужо адказ.

А пасля пацалунку — спакойная, без парываннняў і адчаю, крыўда, прыкры тон пытання:

— Яшчэ адна, так?

І Вадзім — С. Яўдошанка сумеўся. Паспрабаваў няёмка ўсё ператварыць у жарт, але не здолеў. Ціха-ціха сказаў пра жураўлёў, якія ў гэты час ляцелі ў вышыні. І запытаўся:

— Інга, чаму ты выбрала медыцынскі?

Пайшла размова пра керому, пра горад на балоце, пра хор жаб і пра туманы. Ні слова пра каханне. І ўсё — аб ім.

Застаўшыся адзін, Вадзім з дакорам папракне сябе за «самадзейнасць» з пацалункам. А потым Інга вернецца, адна таксама, і мы ўбачым ў яе вачах свячэнне шчасця.

Н. Ганчарэнка ў ролі перадае не толькі сказанае аўтарам, але і тое, што ён хацеў раскрыць, аднак яшчэ не здолеў. Яна выдатна праводзіць сцэну, дзе Інга дазнаецца пра сапраўдны вынік аналізу крыві.

Цікава вырашана рэжысурай сцэна, у якой Вадзім, даведаўшыся пра хваробу Інгі і пра тое, што ёй засталося жыць не больш за два гады, прыходзіць да яе з прапановай аб жаніцьбе. Уявіце, як можна «сыграць» такую сітуацыю? Уся яна — на вастрыні ляза...

Н. Ганчарэнка — Інга не можа і не хоча бачыць свайго каханага. Яна ідзе ад яго за шырму і, стоячы да нас спіной, маўчыць. А ён гаворыць хутка, палка, баючыся, што Інга пераб'е яго. Пра поўдзень, пра паветра, пра сваё каханне. А мы ў гэты час, не бачачы яе вачэй, перажываем буру супярэчлівых пачуццяў Інгі...

Два гады сумеснага жыцця Вадзіма з Інгай былі **жыццём**, а не чаканнем смерці. Мы зразумелі, што Вадзім меў рацыю, калі казаў ёй:

— Ты не памрэш! Мы кінем выклік богу, нячыстай сіле, д'яблу і тым пачварам з чорна-белымі крыжамі... Чуеш? Ты будзеш жыць. Будзеш! Ты мяне яшчэ не ведаеш. Я не аддам цябе! Я кахаю. Чуеш?

У брэсцкай пастаноўцы пераканаўча і лагічна сцвярджаецца ідэя аб перамозе смерці сілай чалавечага кахання. Тэатр пры гэтым не становіцца наіўным суцяшальнікам для гледача і не збіраецца даводзіць, што любоў, нібыта, універсальны сродак ад «луноўкі». Не аб гэтым п'еса! Магчыма, выйграны толькі першы тур змагання. Магчыма, у далейшым надыдзе новы і больш грозны крызіс. Але ж і яго Вадзім і Інга сустрэнуць мужна і трывала, застаючыся Чалавекамі, ператвараючы гадзіну, дзень — у год! У гэтым — мужнасць п'есы і яе мудрасць. І добра, што тэатр, працуючы над ёю, быў таксама мужным і адначасова мудрым.

Аднак...

Хаця і стала ледзь не штампам гэтае «аднак», у дадзеным выпадку без яго не абысціся. І справа не толькі ў тых ці іншых недапрацоўках аўтара ці рэжысуры і выканаўцаў. Калі тэатр выходзіць пераможцам, не абавязкова судзіць яго асобныя памылкі, і тут гаворку мы павядзём аб іншым.

Колькі ўжо разоў на ўсялякіх урачыстых сходах гучалі, побач з папрокамі да драматургаў («мала пішуць!»), заклікі і клятвы аб дбайнасці і чуйных адносінах да тых жа драматургаў з боку тэатральных дзеячоў.

...У пратаколе пасяджэння рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Міністэрства культуры БССР, на якім 11 чэрвеня г. г. абмяркоўвалася п'еса А. Дзялендзіка, записана: «...п'еса павінна трапіць у рукі вопытнага рэжысёра». Гэта думка занатавана і ў пастанове, якую вынесла калегія.

Што ж атрымалася на практыцы?

У Акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы распачынаў працу над пастаноўкай п'есы малады рэжысёр Б. Ганага, чый папярэдні вопыт працы над спектаклем «Яшчэ раз пра каханне» Э. Радзінскага пакуль што наўрад ці гарантуе мудрае абыходжанне з драматургічным матэрыялам.

У Гомельскім тэатры п'есу А. Дзялендзіка ставіць нядаўняя выпускніца рэжысёрскага факультэта Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута Ф. Шчарбакова. У Віцебску і Брэсце — яе аднакурснікі — В. Скарабагатаў і Ул. Серафімовіч.

Давер'е маладым — цудоўная рэч, мы — за!.. А дапамога?

У тым жа пратаколе пасяджэння рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Міністэрства культуры БССР побач з агульнай, вельмі станоўчай ацэнкай, якой заслугоўвае п'еса, ёсць шмат каштоўных заўваг і пажаданняў па дапрацоўцы. Яны — скупыя, сціслыя. Дапамагчы пачынаючаму аўтару ўсвядоміць іх і рэалізаваць — хутчэй пад сілу вопытнаму майстру рэжысуры, а не дэбютанту.

Да прыкладу, калегія выказала аднадушную незадаволенасць тым, як матывуе аўтар сцэну, дзе Інга даведваецца аб сапраўдных выніках аналізу. У брэсцкай пастаноўцы Н. Ганчарэнка ўсё зрабіла, каб апраўдаць псіхалагічна гэту сцэну. Аднак жа акрамя яе тут ёсць яшчэ адна з асноўных удзельніц — Галіна. Актрысе Д. Дойбан не ўдаецца перамагчы даволі грубую просталінейнасць даручанага тэксту. Застаецца незразумелым — адкуль такая бязлітасная жорсткасць яе ўчынку? Чаму дагэтуль Галіна была адным з партнёраў «святой троіцы», у кампаніі з Святланай і Інгай? І наогул, ці варта было ў п'есу, дзе ўзнімаюцца праблемы высокай чалавечнасці, падсяляць такую груба выпісаную, агідную натуру? Ці не больш правільна было б паставіць гэтую сцэну ў залежнасць ад матываў больш тонкіх і складаных?

...Калі пасля прэм'еры мы гутарылі з рэжысурай і кіраўніцтвам Брэсцкага тэатра, выявілася яшчэ нямала іншых прынцыповых «агрэхаў» як у п'есе, так і ў пастаноўцы.

Тады ў чым жа, запытаеце вы, заслуга Г. Волкава і чаму ўсё гэта ён, як галоўны рэжысёр, не заўважыў на працягу дваццаці дзён, калі ўключыўся ў пастаноўку?

Дваццаць дзён — немалы тэрмін. Аднак жа ў дадзеным выпадку яго не хапіла, каб усё заўважыць і ўсё зрабіць. Прычым, і без таго Г. Волкаў, перайшоўшы на дапрацоўку «Чатырох крыжоў», быў вымушаны адкласці планавыя рэпетыцыі сваёй пастаноўкі і таму чарговая прэм'ера тэатра выйдзе са спазненнем. Аналагічная карціна адбылася ў Віцебску і ў Мінску.

...На экземпляры п'есы А. Дзялендзіка надрукавана: «Права першай пастаноўкі належыць Беларускаму акадэмічнаму тэатру імя Янкі Купалы».

На гэты запіс я звяртаю ўвагу не дзеля таго, каб папракнуць тэатры Віцебска і Брэста за тое, што яны абагналі купалаўцаў.

Давайце падумаем пра іншае: дзеля чаго наогул існуе такое права (дарэчы, прадугледжанае і аўтарскім заканадаўствам)?

Напэўна, тут маецца на ўвазе акрамя **правоў заказчыка** (тэатра) і **неабходнасць у сцэнічным рэдагаванні п'есы.**

П'еса А. Дзялендзіка такой рэдакцыі не мае. Адначасова ставячы яе, тэатры ўносілі папраўкі кожны на свой густ і разуменне. Не дзіва, што пачынаючы аўтар пры такіх абставінах мог разгубіцца і часам нават згаджацца з тым, што ішло насуперак яго ідэі.

Ці не пара ўжо нам ад дэкларацый аб беражлівых адносінах да драматургаў перайсці да справы? Навошта нараджэнне новай п'есы ператвараць у марафонскі бег тэатраў да прэм'еры? Згадзіцеся, што ў праве першай пастаноўкі ёсць свая мудрасць: аўтар не можа працаваць над творам адначасова з чатырма тэатрамі.

А ў заключэнне, пасля ўсіх горкіх слоў, я маю выказаць і радасную думку: нешматлікую сям'ю беларускіх драматургаў папоўніў новы аўтар. Ён абяцае шмат. І не толькі абяцае. Справа ў тым, што А. Дзялендзік напісаў ужо другую п'есу, і, здаецца, таксама неблагую.

Пажадаем, каб лёс яе ў тэатры быў больш ураўнаважаны і мудры.

Георгій КОЛАС.

Сцэна з тэлеспектакля «Людзі на балоце». У ролі Міканора — артыст Ю. Сідарэў, Яўхіма — артыст В. Тарасаў.

Фота Ул. КРУКА.

ПРЭМ'ЕРЫ БЛАКІТНАГА ЭКРАНА

ВЯЛІКАЕ ЖЫЦЦЁ ПРАЗ МАЛЕНЬКАЕ АКОНЦА

Часта мы глядзім шырокаэкранныя і нават шырокафарматныя фільмы. Але не часта іх экранныя памеры адпавядаюць жыццёвай шырыні і глыбіні вобразаў ці тэм.

А здараецца так, што і праз маленькі экран можна ўбачыць вялікае жыццё.

Днямі мы яго ўбачылі. Гэта была тэлеэпапея па раману «Людзі на балоце» Івана Мележа. Толькі на гэты раз ніякага здарэння не было: «Людзі на балоце» **павінны** былі з'явіцца на экране. На вялікім ці маленькім. Яны не маглі не з'явіцца, бо раман І. Мележа стаў такой яркай з'явай, якую нельга было не заўважыць, міма якой нельга было прайсці. Беларускае радыё не прайшло міма і зрабіла радыёпастаноўку.

Здавалася, што першым мусіў быў прымерыцца да рамана кінематограф з яго цудоўнымі творчымі і тэхнічнымі магчымасцямі, якому не страшны ніякія памеры і маштабы літаратурнага твора. (Здолеў жа С. Бандарчук даць кінематаграфічнае жыццё такому літаратурнаму тытану, як «Вайна і мір»). Але рэжысёры «Беларусьфільма» пакуль не асмельваюцца. Прыглядаюцца пакуль.

Можна было чакаць, што тэатр не пабаіцца і крыкне—«Цур, маё!..» Пакуль не крыкнуў. (У той час крыку, што няма чаго ставіць з беларускіх твораў,—хоць вушы затыкай).

І менш за ўсё можна было чакаць, што Давід пойдзе на Галіяфа. Што нехта на тэлестудыі набярэцца смеласці і пакажа «Людзей на балоце» праз маленькае, не шырокаэкраннае блакітнае акенца.

І аказалася, што справа не ў памерах экрана. Шырокі ён ці вузкі. Вялікі ці маленькі. Справа ў тым, па якому шляху пайсці, як зрабіць: халоднымі рукамі рамесніка ці трапяткім сэрцам мастака. У першым выпадку і шырокі фармат не паможа, у другім—даволі маленькага акенца, каб убачыць вялікі акіян жыцця.

Рэжысёр-пастаноўшчык А. Гутковіч, сцэнарыст Э. Герасімовіч і ўвесь пастаночны калектыў пайшлі па другому шляху. Іх тэлевізійная пастаноўка—мастацкі эквівалент рамана, што вельмі рэдка ўдаецца пры інсцэніроўках. Тым больш—тэлевізійных. Тут жа можна гаварыць аб відавочнай прынцыповай удачы.

Ні сцэнарыст, ні рэжысёр не імкнуліся зрабіць пастаноўку падобнай на раман, «як дзве кроплі вады». Гэта немагчыма ды і не трэба.

Пастаноўка і раман падобныя па духу, **па душы.** І гэта самае галоўнае. А духам рамана авеяна ўсё ў гэтым спектаклі. Ад пачатку да канца.

З першай жа сцэны вечара на сенакосе пачынаеш «чытаць» тэлевізійны варыянт рамана, бадай, з такой жа асалодай, як і літаратурны арыгінал. Дыхнула Палессем пачатку 20-х гадоў... Вось яны, куранёўцы, пасля цяжкага працавітага дня. Ганна, Васіль, Глушакі... Нават неяк скаланула. Бо вельмі ж яны падобныя на свае арыгіналы. Такімі іх і ўяўляў, чытаючы ў свой час раман. Скнарлівыя вочы Халімона, самаўпэўненае нахабства Яўхіма. Душэўная чысціня Ганны, Васіля... Сутыкнуліся розныя характары, і з раманнай эпічнасцю пачало разгортвацца складанае жыццё тагачаснай палескай вёскі, спраецыраванае на экран праз душэўны свет герояў. Рэжысёр, як і аўтар рамана, не спяшаецца паскараць падзеі, не надае ім знешне кінематаграфічны тэмп, а ўважліва прыглядаецца да кожнага душэўнага руху героя, да кожнай падзеі, якая ў той ці іншай ступені раскрывае чалавечыя характары. Раман І. Мележа — глыбокае даследаванне чалавека, і пастаноўка па ім развіваецца на экране ў тым жа рэчышчы.

Можа таму мы так часта бачым на экране буйныя і ўзбуйненыя планы твараў, іменна твараў герояў, калі рэжысёр з аператарам запрашаюць гледача як мага глыбей зазірнуць праз вочы героя ў яго душу, прачытаць яго думкі, пачуцці.

І яны «чытаюцца». Хто не запомніў сцэны прызнання ў каханні Васіля і Ганны ноччу ля плота, трапяткую, хвалюючую сцэну, у якой уся танчэйшая гама чыстага глыбокага пачуцця перададзена жыццём душы, што свяцілася праз вочы і твары Васіля і Ганны!.. Дапамагалі яшчэ і словы, але толькі дапамагалі, бо самае галоўнае было сказана не словамі.

Тут, дарэчы, нечакана раскрыўся багаты драматычны талент маладых купалаўскіх акцёраў Л. Давідовіч і Г. Гарбука. З гэтай сцэны яны канчаткова авалодалі даверам і верай гледача. І хоць яны амаль не сыходзілі з экрана, але кожнае з'яўленне ў кадры Ганны і Васіля чакалася з нецярплівасцю. А ў сцэне вяселля Л. Давідовіч дасягнула драматычнага ўзлёту Канярыны Астроўскага. Яна не знізіла гэтага ўзлёту і ў такіх востра драматычных сцэнах, як смерць і пахаванне дзіцяці, сутычка з Яўхімам, сустрэчы з Васілём у гумне і ля стога.

І Васіль па сваім душэўным настроі быў нароўні з ёй. Асабліва ў другой частцы спектакля Г. Гарбук дамогся ў вобразе Васіля эпічнасці, душэўнай стрыманасці, пад якімі тоіцца цяжка перажытае і глыбока перадуманае.

Удача і прывабнасць спектакля не толькі ў майстэрскі створаных лірычных вобразах Ганны і Васіля. Не менш хвалюючь і яго сацыяльныя вобразы. Больш таго: у гэтых вобразах спектакль дасягае асаблівай сілы. І тут зноў даводзіцца гаварыць аб новай грані акцёрскага таленту.

В. Тарасава часта прымушалі ствараць на сцэне інфантыльных маладых людзей нашага часу, запэўняючы маладога акцёра, што гэта і ёсць яго «амплуа». А ў «Людзях на балоце» В. Тарасаў узяў ды і зрабіў вобраз кулацкага сынка Яўхіма. Зрабіў шчодра, сакавіта, з размахам.

Якое ж страшнае звярынае нутро адкрылася пад абліччам зухаватага, вясёлага і даволі сімпатычнага хлопца, калі жыццё замахнулася на той свет, да якога ён належыць. Рана ці позна, а зямельны надзел Глушака мусіў быць абрэзаны. Васіль зрабіў гэта рана. І вось мы бачым на экране страшэнную сцэну смяротнай схваткі за зямлю Яўхіма і Васіля (дарэчы, цудоўна пастаўленую і знятую!). Вось дзе ашчэрылася кулацкая душа Яўхіма, які, бадай, пераўзышоў у сацыяльнай нянавісці і прагавітасці свайго бацьку.

І гэта не класавая маска. Яўхім да фізічнага адчування жывы чалавек, якому верыш. Верыш нават, што ён мог пакахаць Ганну, а Ганна, хоць часова, але магла паддацца яго хлапечай прывабнасці.

Таму, відаць, яна і апынулася ў востра драматычнай жыццёвай сітуацыі, калі часовае асляпленне скончылася і яна ўбачыла перад сабой не мужа, а жорсткага, бяздушнага гаспадара-кулака.

Даволі было зірнуць у халодныя, поўныя злосці вочы Яўхіма перад тым, як ён пачаў біць Ганну, каб адчуць, што акцёр знайшоў самы яркі і завяршаючы мазок для поўнага партрэта кулацкага сына. Пасля бойкі на раллі ў В. Тарасава гэта самая хвалюючая сцэна, дзе акцёр блісну ў майстэрствам сацыяльнай характарыстыкі вобраза і пераўвасаблення.

Яшчэ больш сацыяльна завостраны атрымаўся вобраз бацькі Яўхіма Халімона Глушака ў выкананні артыста З. Стомы. Гэты вобраз акцёр стварыў у лепшых традыцыях купалаўскага тэатра, у традыцыях сапраўднага мастацкага рэалізму, хоць на экране гэты рэалізм не столькі сцэнічны, колькі кінематаграфічны.

З. Стома разумее, што яго Глушак жыве ў новых для яго ўмовах, ва ўмовах савецкага ладу. І хоць пачаліся толькі першыя гады Савецкай улады, але Глушак адчуў неабходнасць сацыяльнай мімікры. Ён не дужа супраціўляўся, калі Яўхім рашыў ажаніцца на Ганне—дачцы несамавітага бацькі (можа, такое сваяцтва і не лішнім будзе калі-небудзь); Глушак не супраць, каб Яўхім адлупцаваў Васіля за зямлю, але не настолькі, каб адказваць перад уладай; калі Глушаку прыслалі разнарадку на 56 пудоў хлеба, ён напяў на сябе ледзь не ашмоцце і пайшоў у райвыканком плакацца, каб хоць крыху збавілі (пра гэтым ён ужо ў душы ўсіх і кожнага, хто падкопваецца пад яго кулацкую гаспадарку).

Для кожнага такога павароту З. Стома знаходзіць дакладныя псіхалагічныя штрыхі, з якіх у цэлым складваецца вобраз хітрага, выкрутлівага і небяспечнага ворага.

Вобраз Глушака тым больш важны, што ён кампенсуе сабой у нейкай меры частковую адсутнасць у спектаклі некаторых сацыяльных матываў і падзей, якія былі ў рамане. Праўда, многія з тых падзей раскрываліся пісьменнікам у сцэнах сходаў, нарад, якія менш за ўсё ўдаюцца ў тэлеперадачах. Не вельмі ўдала атрымаліся асобныя з іх і ў гэтым спектаклі. Можа таму вобразы Міканора і Апейкі некалькі дэкларацыйныя і не зусім акрэсленыя.

Увогуле ж спектакль на рэдкасць ансамблевы. Купалаўскія акцёры (у асноўным яны выконваюць усе галоўныя ролі) апынуліся ў сваёй роднай стыхіі і зноў, як калісьці, заблішчэла іх непаўторнае майстэрства. Кожны на сваім месцы! Ул. Дзядзюшка (Чарнушка), С. Станюта (Глушачыха), М. Бялінская (мачыха Ганны), П. Пекур (Шабета), Г. Макарава (маці Васіля), былы купалавец І. Шаціла—усе яны скарысталі са свайго багатага творчага арсенала самае лепшае, што набылі калісьці на беларускай сцэне Глядзіш на іх і думаеш, як жа згаладаліся яны па такіх спектаклях, у шырокім сэнсе—народных, з якіх складаўся ў свой час залаты фонд беларускіх тэатраў!

«Людзі на балоце» на тэлеэкране—не зусім спектакль. І, можа, менш за ўсё спектакль. Гэта хутчэй—тэлефільм. Раман пададзены больш у кінематаграфічнай трансфармацыі. І як ні дзіўна, тэатральныя акцёры іграли з глыбокім адчуваннем кінематаграфічнага мастацтва. Некаторых з іх цалкам можна было б перанесці з маленькага на вялікі экран.

І ўзнікае яшчэ адна думка. Чаму так рэдка мы бачым нашых акцёраў у беларускіх фільмах? Чаму рэжысёры «Беларусьфільма» нават на эпізадычныя ролі прывозяць акцёраў з Масквы, Ленінграда, Кіева?.. А той жа В. Тарасаў ці М. Яроменка здымаюцца ў Ленінградзе, Маскве, Адэсе...

Але гэта між іншым. Галоўнае, што Беларускае тэлебачанне зрабіла добрую справу, экранізаваўшы адзін з лепшых твораў беларускай літаратуры. Пастаноўка прысвечана 50-годдзю Савецкай улады. Прысвячэнне—дастойнае вялікай даты.

Трэба сказаць, што праца над творам на студыі працягваецца. Праз нейкі час мы ўбачым трэцюю частку мележаўскай эпапеі. Спадзяёмся, што яна будзе на ўзроўні першых дзвюх.

Кастусь ГУБАРЭВІЧ.

Калі Марат Рубінштэйн, артыст Дзяржаўнага народнага аркестра БССР, наш даўні і актыўны пазаштатны фотакарэспандэнт, прынёс у рэдакцыю гэтыя здымкі, таварышы мне прапанавалі:

— А тэкст напішы ты. Пра тое, як гэта робіцца. Ты ж там працаваў і ўсё ведаеш.

Пад словам «як гэта робіцца» меліся на ўвазе закулісныя будні радыё (закулісныя, вядома, у пераносным сэнсе), тое, з чым не дужа знаёмы нават самыя настырныя радыёслухачы—з тых, напрыклад, што адразу пазнаюць, хто з дыктараў вядзе канцэрт або чытае апошнія паведамленні.

Сказаць па праўдзе, я згадзіўся не вельмі ахвотна.

БЕЛАРУСКАМУ РАДЫЁ—40 ГОД

Як гэта робіцца

Я ўспомніў, што іменна так — «Як гэта робіцца»—называецца славуты нарыс Карэла Чапека пра стварэнне газеты, спектакля, кіно. Добра ведаючы ўсе гэтыя кухні—і газетную, і тэатральную, і «кіношную»—пісьменнік паказаў іх надзвычай дасціпна і ў той жа час праўдзіва, вычарпальна.

На жаль, я не магу пра сябе сказаць, што гэтак жа добра ведаю радыё. Хоць сапраўды там працаваў. Хоць і цяпер даволі часта заходжу ў прыгожы гмах на Красная вуліцы — Дом радыё. То ў якасці аўтара, то проста адведаць таварышаў.

Беларускае радыё сёння—гэта такі складаны і вялікі камбінат, што за год работы ў яго штаце можна атрымаць толькі павярхоўнае ўяўленне аб усім, з чаго ён складаецца. Ды і то, калі будзеш чалавекам настойлівым дапытлівым.

Сённяшняе Беларускае радыё — гэта магутнае інфармацыйна - прапагандысцкае агенцтва. З аператыўнасцю яго, з аб'ёмам прапануемай ім інфармацыі, з колькасцю людзей, што гэтай інфармацыі чакаюць, ніякая іншая ўстанова ў рэспубліцы суперничаць не можа.

Гэта — выдатны артыстычна-музычны канцэрн, у склад якога ўваходзіць шмат таленавітых творчых калектываў і салістаў.

Гэта — тэхніка літаральна на мяжы фантазіі, гэта апаратура, дасканаласць якой выклікае

Усё-такі гэта вельмі прыемна вымаўляць: «Апошнія паведамленні чыталі Лілія Стасевіч і Ілья Курган...».



Ніна Азаркевіч, дажурная гаспадыня эфіру.

Нават самыя неслухі прымоўкнуць, слухаючы казку Лідзіі Іванаўны Ржэцкай.

адчуванне трапяткой павагі нават у людзей, многа больш за мяне дасведчаных у таямніцах адкрытай Аляксандрам Сцяпанавічам Паповым мажлівасці бяспроваднай перадачы сігналаў на адлегласці.

Чытач, вядома, памятае, як у Чапека расказваецца пра друкарскую ратацыйную машыну. «Калі б яна стаяла дзе-небудзь на беразе Замбезі,—жартаваў Чапек, — тубыльныя плямёны прымалі б яе за бажаство і прыносілі б ёй ахвяры, такая гэта выдатная рэч...» Бяру на сябе смеласць сцвярджаць, што цэнтральная апаратная, якую бачыце вы на першым сярод здымкаў, можа выклікаць не меншую пашану. Дастаткова далікатным жаночым рукам дзяжурнага тэхніка Ніны Азаркевіч ці яе сяброўкі-зменшчыцы памяняць становішча некалькіх кнопак на гэтых зззяючых шчытах, і скораны чалавекам эфір пачынае несці ў нябесны высі над абсягамі Беларусі голас Масквы ці Брэста, Мінска ці Смаленска—у залежнасці ад таго, як прадугледжана гэта складзеным на зямлі раскладам радыёгучання.

Канечне, гэта толькі гаворыцца так—голас Масквы ці Мінска. Маюцца ж на ўвазе, зразумела, галасы канкрэтных людзей, якім на гэты час аддаў свае мікрафоны той або іншы горад. Найчасцей — галасы дыктараў.

Вось прафесія, якая проста-такі асуджае яе ўладальніка на вядомасць! Гэта была б, мусіць, нялёгкая задача—знайсці ў Беларусі чалавека, які б не ведаў галасоў Лініі Стасевіч і Ільі Кургана, вядучых дыктараў Беларускага радыё, якіх вы бачыце на здымку ў хвіліну мытання апошніх паведамленняў. Гэтак жа, як нялёгка было б знайсці чалавека, які не чуў бы галасоў і імёнаў іх калег Любові Батвіннік, Мікалая Анціпава, Уладзіміра Шаліхіна, Галіны Сідзельнікавай.

Слухачу, праўда, вядомы толькі парадны бок іх работы—трошкі ўрачыстае, або спакойнае, дзелавое (гэта залежыць ад тэксту, які чытаецца) гучанне іх голасу ў рэпрадуктары ці прыёмніку. А вось чаго яно дыктару каштуе, гэтае ўрачыстае ці спакойнае, ніплівае ці гнеўнае гучанне яго голасу ў эфіры—якой вялікай унутранай напружанасці, якіх доўгіх папярэдніх пошукаў інтанацыйнай дакладнасці, якіх, урэшце, нерваў — гэта, так сказаць, сакрэт вытворчасці.

Спадзяюся, Ілья Курган не пакрыўдзіцца, калі на правах даўняга знаёмства я ўспомню тут нашу з ім сустрэчу гадоў пятнаццаць назад. Выпускнік Беларускага тэатральнага інстытута, ён толькі пачынаў тады працаваць на радыё. Помню, я яго з гэтым павіншаваў, але ён (трэба ведаць курганаўскі тэмперамент!) у адчаі схапіўся за галаву:

— Я часова, часова на гэтай катарзе! Нізавошта там не застануся!..

Праходзілі гады. Час ад часу мы сустракаліся зноў—і зноў я чуў тое самае:

— Няма больш маіх сіл! Пакуль не звар'яцеў, уцяку! От толькі да лета...

І так і не ўцёк, хоць магчымасць была неаднаразова—такі акцёр і чытальнік, як Курган, быў бы добра сустрэты і ў тэатры, і ў філармоніі, і на выкладчыцкай рабоце (дарэчы, ён і выкладае цяпер час ад часу майстэрства чытання ў навучальных установах). Не ўцёк, хоць цяжкасці сваёй работы не дужа перабольшваў—дастаткова сказаць, што прафесія дыктара нават медыцынска-прафсаюзным пералікам адносіцца да шкодных: гэтак жа, як шахцёры, як работнікі гарачых цэхаў, дыктары атрымліваюць падоўжаны адпачынак... Не ўцёк і не ўцячэ, бо прыносіць яму работа велізарнае маральнае задавальненне, бо ёсць у ёй прывабная сіла, якая не дазваляе гэта зрабіць.

Канечне, радыёслухачы не ўбачаць гэтай амаль тэатральнай мізансцэны. Але паспрабуйце голасам перадаць сутычку, нерухома седзячы ля стала!..

І на ўсіх канвертах адрасі: «Мінск, радыё...»

Але нават пры самай вялікай павазе да нашых таленавітых дыктараў будзе справядліва сказаць, што перадачы радыё выглядалі б адностайнымі і беднымі, калі б у эфіры гучалі толькі іх галасы. Гэта і прымушае нас уважліва слухаць штораніцы праграму перадач, што прывыклі мы да цік

Паэтычная паверка

Ніл ГІЛЕВІЧ

■ ■ ■

Вось і прыйшла пара для справаздач:
Авансу больш не выдаюць, хоць плач.
І так замнога змарнаваў авансу.
Бухгалтар-крытык зверыў па балансу:
На кожную удачу — сем няўдач.

Ды бачу й сам, перагартаўшы дні,
Як слепа, вобмацкам прайшлі адны,
Як недагружана, амаль улегцы,
Другія несліся па той калейцы,
Дзе сёння — свята, заўтра — выхадны!..

Усё, што браў гадамі напавер,
Я мушу цалкам выплаціць цяпер —
За дні, а можа быць, і за гадзіны...
Дапамажы, дарадчык мой адзіны —
Да лёгкасці бяздумнай недавер!

■ ■ ■

У старажытным гарадку над Гайнаю,
Ля зруйнаванай кляштарнай сцяны,
Я думаю, як дзіка, як нядбайна мы
Парою ставімся да старыны.

Чым ганарыцца перад светам варта нам,
Чым даражыць павінен чалавек, —
Ірвём, грызём, руйнуем экскаватарам —
Тэхнічны, балазе, дваццаты век!

Гісторыю трымаюць у пашане ўсе.
Навошта ж безаглядна так наўсцяж
Мы разбурыць мінулае спяшаемся,
Як бы яно — галоўны вораг наш!

Хіба не з працы гаратліўцаў-прадзедаў
Яно вякамі паўставала тут!
Чаму ж няўдзячна гэтак абакрадзена
Зямная памяць іх зямных пакут!

Асцеражней, таварыш, са святынямі.
Чым замяніць іх думаеш, скажы!
Страшней за ўсё, як робяцца пустынямі
Палеткі плодныя людской душы.

СТАРЫЯ ДРУКАРНІ

У розных кутках беларускай зямлі
(Там помнікі б з мармуру высечы!)
Славутыя колісь друкарні былі —
Гадоў таму ледзь не паўтысячы.

Даўно супачылі ў зямлі друкары,
А плён іх сыноўняга подзвігу
Сцірала гісторыя з гэнай пары —
Дзе кроўю, дзе гучна, дзе поціху.

І месцы ўжо тыя нялёгка знайсці,
Парослыя крыўдамі-бедамі,
Дзе ўсходзілі першыя кветкі цвісці
Красой, між народаў няведамай.

О, як бы разросся той кветнік, той сад,
Хоць вёсны былі неспагаднымі,
Калі б не стаптаў заваёўнік-магнат,
Калі б чужакі не спаганілі!

Але, як зярняты з угрэтай раллі,
Слязамі і кроўю палітыя,
Ізноў прарасталі, буялі, цвілі
Бяссмертныя родныя літары!

І чулася, чулася ў стуку станкоў,
Што ім не замоўкнуць заклятымі,
Што будуць яны за хрыбтамі вякоў
Грымець паліграфкамбінатамі.

СНЕЖАНЬСКАЯ ІМПРЭСІЯ

Белыя
сыпяцца долу крышталікі,
Белыя
крышацца хмаркі ўгары.
Сосны
захутаны ў белыя шалікі.
Белая
мітусь у белым бары.
Белая,
мяккая ціша няхрусткая,
Белай
дрымотай спавіты кусты.
Белае
белле... Зіма беларуская...
Што ж мне
не дорыш снягурачку ты!

ПРЫВІТАЛЬНАЕ

Прачытаўшы вершы
васемнаццацігадовых

Спявайце, юныя паэты!
Спяліце ў бурах пачуцця
Неўтаймаваны боль планеты,
Непераможны крык жыцця!

Магчыма, вам якраз і здзейсніць
Дзядоў вялікіх запавет:
Узняцца так на крыллях песні,
Каб чуў і бачыў цэлы свет!

Назло прарокам самазваным,
Што глуха каркаць пачалі,
Спявайце спевам нечуваным
На мове любай вам зямлі!

Спявайце, помнячы нязменна:
Пакуль паэты будуць пець —
Не быць Радзіме безыменнай,
Зямлі бацькоў — не анямець!

БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА ПА ТЭЛЕФОНЕ

У рэспубліцы працуюць некалькі выдавецтваў, якія выдаюць спецыяльную літаратуру — навуковую, тэхнічную, сельскагаспадарчую, навукова-папулярную і г. д. Як жа наладжана прапаганда гэтых выданняў? Ці даходзяць рэкламныя матэрыялы да магазінаў, скажам, на вёсцы, ці ведае пакупнік, якія кнігі па яго спецыяльнасці рыхтуюцца або выйдуць у свет у бліжэйшы час?

Пошукі новых форм і метадаў кніжнага гандлю, рэкламы, вывучэнне попыту на новыя выданні не спыняюцца ні на адзін дзень. Гэтай справе аддаюць шмат увагі і ў Беларусі, і ў братніх рэспубліках, і ў краінах сацыялістычнага лагеру.

Мне хочацца расказаць пра цікавую навінку, якая нарадзілася ў нашых суседзяў — у Вільнюсе. Дзяржаўная рэспубліканская бібліятэка Літвы ў любы час дае чытачу бібліяграфічную даведку. Для гэтага дадаткова толькі набраць па гарадскім тэлефоне нумар 7-70-01, як адразу ў трубцы пачуеш магнітафонны запіс. Кораценька і кваліфікавана бібліяграф паведаміць вам пра асноўныя кніжныя навінкі, якія паступілі ў бібліятэку за апошнія суткі. І проста, і кожнаму даступна!

Ужо некалькі год у Маскве Дом грамзапісу па заказах кнігагандлёвых арганізацый робіць кароткаметражныя (на 3—5 хвілін) валікі магнітафонных стужак, выкарыстоўваючы якія, можна перадаваць па мясцоваму радыё змястоўныя анатаваныя паведамленні аб новых кнігах, што паступілі ў той або іншы магазін.

Не так даўно супрацоўнікі аддзела кнігі Брэсцкага аблспажыўсаюза паказалі мне атрыманыя з Масквы валікі з магнітафоннай бібліяграфічнай рэкламай. Задумана сапраўды добрая справа. Паступае, напрыклад, у кнігагандлёвую сетку якога-небудзь раёна новае выданне. У той жа дзень мясцовае радыё ў сваіх апошніх паведамленнях раніцай і вечарам трансліруе музычную радыёрэкламу на новую кнігу. Радыёкропкі цяпер ёсць у кожным калгасе, у кожным доме. Такім чынам, паведамленне аб новай кнізе з незвычайнай хуткасцю дойдзе да самага масавага чытача.

Думаецца, што для пачатку было б мэтазгодна правесці эксперымент для праверкі эфектыўнасці такой кніжнай радыёрэкламы ў адным з раёнаў Беларусі. Скажам, адначасова з завозам у раённую кнігагандлёвую сетку новай актуальнай кнігі, прызначанай спецыяльна для працаўнікоў вёскі, раённая газета і радыё даюць інфармацыю.

У той жа час у суседнім раёне, які распаўсюджвае тое ж выданне, справа вядзецца пастарому. Затым правесці аналіз-параўнанне. У выпадку значнага эфекту, вопыт прапаганды кнігі з дапамогай магнітафоннай бібліяграфічнай рэкламы варта было б шырока распаўсюдзіць. Упэўнены, што перавага будзе на баку новага спосабу рэкламы. У выніку тыражы многіх выданняў, так неабходных хлебаробам, намнога павялічыліся б.

І. КАРШАКЕВІЧ,
рэдактар выдавецтва «Ураджай».

Павел БЕКІШ.

Слова пра малодшага сябра

РЭЖЫСЁР ЗНАХОДЗІЦЬ РАШЭННЕ...

КАЖУЦЬ, прафесія рэжысёра — прафесія сталасці. Яна патрабуе ад мастака і пэўнага жыццёвага вопыту, і эрудыцыі, і шырыні кругагляду. Але ці значыць гэта, што за рэжысуру трэба брацца, толькі закончыўшы ўсе разлікі з «творчай маладосцю»? Ці не зацягваем мы іншы раз штучна гэты перыяд? На мой погляд, недзе каля трыццаці самы час...

Якраз у гэты ўзрост і ўступіў Павел Бекіш — малады рэжысёр Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра.

Шлях Бекіша ў рэжысуру просты і натуральны. У дваццаць з нечым гадоў кіраўнік калектыву мастацкай самадзейнасці, потым кароткае акцёрства ў Брэсцкім абласным драматычным тэатры і нарэшце вучоба ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце, дзе яго настаўнікамі былі А. Яфрэмаў і выдатны прадстаўнік беларускай рэжысуры народны артыст БССР К. Саннікаў.

Вось ужо другі сезон П. Бекіш у Магілёве. За гэты час ён паставіў «Алую кветку», «Том — вялікае сэрца», «Машаньку», «Свеціць ды не грэе». Я пералічыў спектаклі ў тым парадку, у якім яны ішлі. Не цяжка заўважыць, што перад рэжысёрам увесь час паўставалі ўсё больш складаныя задачы. Калі «Алая кветка» адрасавана дзіцячаму гледачу, а «Том — вялікае сэрца»—юнацтву, дык «Машанька» ўжо зусім «дарослы» спектакль, а «Свеціць, ды не грэе» — уступ у рускую класіку.

У мяне няма магчымасці расказаць пра ўсе работы П. Бекіша, хоць гэта і было б цікава. Спынюся на апошняй, на мой погляд, самай сталай.

«Свеціць, ды не грэе» А. Астроўскага і М. Салаўёва — п'еса, пра якую ўспамінаюць не часта.

... Ганна Уладзіміраўна Ранёва, земляўласніца, вяртаецца з-за граніцы ў родныя мясціны. Ёй трэба хутчэй прадаць апошні маёнтак, каб зноў кінуцца ў вандроўкі. Нявесела сустрэлі Ранёву родныя пенаты: дом напаўразбураны, сад спуставаны, дваровыя пастарэлі. Суседзі — адзін памёр, другі, што ў маладосці заляцаўся да яе, ажаніўся, растаўсцеў. І толькі сын памёршага суседа Рабачова — Барыс ды дачка яе былога аканома Васількова — Вольга жывуць молада і ярка, горача і шчыра кахаюць адно аднаго.

І вось у гэты сонны, ціхі край, у застойнае жыццё ўрываецца вопытная «львіца». Яна прыгожая, можа каго захоча спакусіць. Прыкметная яна ў гэтым краі, як яркі агонь уначы. Але цяпла ад гэтага агню ні для кога няма. Ён не толькі не грэе, ён знішчае ўсё навокал: чужы спакой, чужое шчасце, нават маладое жыццё Вольгі Васількова. І, нарабіўшы бяды, Ранёва спяшаецца выехаць. Хутчэй у Парыж, да яркіх агнёў, да бесклапотнага жыцця, да новых раманчыкаў.

П. Бекіша як пастаноўшчыка падпільноўвала вялікая спакуса. Можна было вырашыць спектакль як традыцыйную драму, паставіўшы па адзін бок «дэманічную злачынку» Ранёву, а па другі — яе ахвяры. Спектакль атрымаўся б «касавы», ніхто б рэжысёра не папракнуў. Але П. Бекіш не пайшоў па гэтаму лёгкаму шляху. Ці можна сапраўды ў нашы дні ўсур'ёз іграць пакуты тлустага Залешына і яго Аўдоцці Васільеўны, хоць яны і ахвяры Ранёвай? І ці ў «дэманізме» Ранёвай уся тут справа?

Рэжысёр знайшоў сваё, сугучнае часу рашэнне. На ролі персанажаў, якія трапляюць у відавочна драматычныя сітуацыі (акрамя маладых закаханых), ён прызначыў выканаўцаў камедыйнага плана, і гэтым адразу змясціў акцэнты ў спектаклі, надаў яму трагікамічнае гучанне.

Вось на сцэне Залешын, сусед Ранёвай. Яго іграе народны артыст БССР С. Бульчык. Камедыйныя ўласцівасці выканаўцы, яго сцэнічная фактура такія, што чым сур'ёзней і глыбей артыст раскрывае драму Залешына, тым трагікамічней яна выглядае. Зала смяецца, і для сённяшняга гледача рэакцыя гэта бясспрэчна натуральная.

Сакавітымі мазкамі малюе заслужаная артыстка БССР Ю. Гальперына вобраз жонкі Залешына. Роля вырашана ў тым жа трагікамічным ключы, і Аўдоцына гора хутчэй смешыць, чым узрушае глядзельную залу.

А вось трагедыя маладых нікога не пакідае раўнадушным. Рэжысёр дапамог артысту Ф. Куставу знайсці дакладныя фарбы для Барыса. Маладосць, унутраную чысціню, кволасць Вольгі падкрэсліла ў сваёй гераіні Л. Магілёва. Актрыса, аднак, часам упадае ў меладраму, аплаквае сама сябе, а гэта ўжо выпадае з агульнай задумы.

Нельга пагадзіцца з тым, як трактуюцца ў спектаклі Ільіч і Сцепаніда. Муж і жонка ўвесь час сварацца і быццам вельмі абрыдлі адно аднаму. Ці гэткімі фарбамі трэба было маляваць нямногіх прадстаўнікоў народа ў спектаклі? Па п'есе ж старыя, пражыўшы разам доўгае жыццё, несумненна кахаюць і падтрымліваюць адно аднаго. Нездарма спустошаная Ранёва зайздросціць ім.

А цяпер пра тое, з чаго варта было б пачаць гаворку, — пра выкананне ролі Ранёвай заслужанай артысткай РСФСР Э. Міхайлавай. Што такое Ранёва? Драпежніца, марнатраўца, адна з тых, што распрадавалі Расію гуртам і ў раздроб, ператвараючы ў золата пот і кроў яе людзей. Як такую не зненавідзець, не закляйміць? Аднак у спектаклі гэтага не зроблена.

Э. Міхайлава іграе Ранёву па магчымасці прыемнай і прывабнай нават у самых непадыходзячых для гэтага сітуацыях. Актрыса валодае вялікім упэўненым майстэрствам, голас яе гучыць гнутка, пластыка дакладная. Усё гэта працае на вобраз пры рашэнні першай часткі задачы — «свеціць». А вось «не грэць» артыстка не захацела. Не захацела расчараваць у сваёй гераіні глядзельную залу, быццам, баючыся, што міжволі глядач перанясе на актрысу адносіны да вобраза. Ранёва вінаватая ў смерці Вольгі, яна разбурыла шчасце Барыса, разбэсціла простую дзяўчыну Дашу, пакіне без прытулку і кавалка хлеба старых дваровых. І такому чалавеку дазволіць спакойна пакінуць сцэну? Не высцебаць, не знішчыць?!

Крыўдна за гэты пралік рэжысёра, тым больш, што ў агульным спектакль атрымаўся цікавым, вельмі па-сучаснаму вырашаным.

Ацэньваючы работу рэжысёра, нельга не адзначыць дакладнасць мізансцэн. Запамінаюцца, напрыклад, адыход Худабаева, зачараванага першым знаёмствам з Ранёвай, яго падглядванне ў шчылінку непрычыненых дзвярэй, нечаканыя шматразовыя вяртанні. Або выхад Ранёвай і Барыса пасля іх збліжэння. У месячным святле Барыс нібы паж нясе канец газавага шаліка пераможцы Ранёвай. Як гэта пераканаўча і дакладна!

Рэжысёр валодае такімі тонкімі мастацкімі сродкамі, як тэмп і рытм. Дзеючыя асобы ў спектаклі жывуць кожны ў сваім рытме, гэта ўносіць пэўную разнастайнасць у сцэнічны малюнак.

Павел Бекіш праявіў сябе як удумлівы пастаноўшчык, настойлівы шукальнік. Хочацца, каб з гадамі, калі да яго прыйдуць і вопыт і сталасць, творчы непакой па-ранейшаму заставаўся галоўнай рысай яго характару.

І. ЛАКШТАНАЎ.

Юрый Семяняка і Алесь Бачыла—частыя гасці музычнай рэдакцыі.

Праз дзве гадзіны да запісу Альфрэда Мітрафанава будуць прыслухоўвацца тысячы і тысячы бялельшчыкаў.

налістаў адпраўляюцца штодзень з такімі вось маленькімі чамаданчыкамі, падобнымі на тыя, з якімі ходзяць у басейн ці на тэнісны корт, на заводы і стадыёны, у школы і ў навуковыя інстытуты, і вяртаюцца потым у Дом радыё з жывым чалавечым роздумам, адказам на пытанне, водгукам на палітычныя і міжнародныя падзеі, усмешкай...

Але гасцінная «гара» яшчэ больш любіць, калі «Магамет» прыходзіць да яе. Фотакарэспандэнт пабыў у Доме радыё толькі некалькі гадзін, а бачыце, колькі спаткаў там жаданых, дарагіх гасцей. Лідзія Іванаўна Ржацкая рэпеціравала казку, яную ў адзін з недалёкіх вечароў пачуюць маленькія аматары «Вячэрняй калыханкі». Кампазітар Юрый Семяняка і паэт Алесь Бачыла рыхтаваліся да паказу сваёй новай песні. Група артыстаў запісвала ў студыі астапенкаўскі «Эдэм».

«Эдэм» вы мелі ўжо магчымасць паслухаць. Калі не слухалі, сачыце за праграмай і чакайце паўторнай перадачы. Раім. Бо «Эдэм» — адна са значных і цікавых апошніх работ літаратурна-драматычнага вяшчання. Адна са значных і цікавых апошніх работ галоўнага рэжысёра Беларускага радыё Марыны Троіцкай.

Хачу выкарыстаць юбілей, каб прызнацца вам, Марына Дзмітрыеўна, што я заўсёды вельмі рады, калі мая работа на радыё трапляе ў вашы рукі. Што б гэта ні было — інсцэніроўка, апавяданне, радыёп'еса. Бо вы заўсёды вельмі шчыра скажаце, што аўтару ўдалося, а дзе яму здрадзіў густ, бо слухаць вас і нават спрачацца з вамі — значыць, нечым сябе ўзбагачаць, бо бываць у вас на рэпетыцыях — гэта атрымліваць урок, як трэба дакладна выяўляць і даносіць думку, як пазбягаць фальшу, невыразнасці, таннасці, шаблону...

На нашым здымку вы бачыце Марыну Троіцкую з гукарэжысёрам Віктарам Лешчанком. Вось яшчэ — чыста «радыйная» прафесія. Нават па краёчку стала, на якім ляжаць рукі Лешчанка, вы можаце ўявіць, наколькі складаная апаратура (дарэчы, яна тут самая сучасная, самая дасканалая) забяспечвае чысціню, якасць, выразнасць гучання слова і музыкі пасля так добра вядомай вам візітнай карткі Беларускага радыё—пазыўных «Радзіма, мая дарагая...»

Хай жа заўсёды гучаць гэтыя дарагія нашаму сэрцу пазыўныя, хай выклікаюць у нас пачуццё ўдзячнасці слаўнаму атраду нашых таварышаў—творчых работнікаў радыё і тэлебачання, пра некаторыя штрыхі нялёгкай, але радаснай работы якіх мы паспрабавалі тут расказаць.

Уладзімір МЕХАЎ.

«А тут мы ўвядзём музыку...» — гаворыць Марына Троіцкая.

ВЫПУСКАЮЦЬ ВЫДАВЕЦТВЫ МАСКВЫ

Кожны год цэнтральныя выдавецтвы выпускаюць кнігі беларускіх аўтараў. І з кожным годам колькасць гэтых кніг павялічваецца.

Так, выдавецтва «Советский писатель» у будучым годзе плануе выдаць 12 кніг беларускай прозы і паэзіі. Сярод іх — цыкл аповесцей Івана Шамякіна «Трывожнае шчасце», зборнік апавяданняў Янкі Скрыгана «Месячная ноч», апавяданні і аповесць «Жнівеньская раніца» Алеся Пальчэўскага, кніга «Тут я жыву» Аляксея Кулакоўскага, раман «Віленскія камунары» Максіма Гарэцкага, зборнік апавяданняў «Палескія былі» Міколы Ракітнага, раман Івана Пташнікава «Чакай у далёкіх Грынях», зборнік вершаў Антона Бялевіча «Салаўіны сад», «Вышыня» Сяргея Грахоўскага, «Небасхілы» Пімена Панчанкі.

Выдавецтва «Художественная литература» выдае зборнік апавяданняў Янкі Брыля «Пад гоман вогнішча», маленькія аповесці і апавяданні Івана Мележа «Спатканне за горадам», зборнік вершаў Андрэя Александровіча «Таполі і сосны».

«Молодая гвардия» ў наступным годзе выпусціць аповесць Івана Пташнікава «Лонва», а выдавецтва «Детская литература» — беларускую народную казку «Сіняя світа навыварат сшыта».

Ваеннае выдавецтва ў серыі «Бібліятэка салдата і матроса» выдае зборнік апавяданняў Васіля Хомчанкі «Падкова».

Ва Усесаюзным выдавецтве «Музыка» выйшаў зборнік песень Ю. Семянякі для голасу і хору ў суправаджэнні фартэпіяна ці баяна. У зборнік уключана дзевяць твораў. У наступным годзе гэтае ж выдавецтва мяркуе выпусціць два вялікія творы беларускай музыкі—Другую сімфонію Я. Глебава і Сюіту з балета «Святло і цені» Г. Вагнера.

Выдавецтва «Советский художник» выпусціць у наступным годзе камплект манаграфічных паштовак — рэпрадукцый твораў народнага мастака БССР В. Цвіркі.

М. ПІЧХАДЗЕ.

Масква.

З ПРЫВАТНЫХ ЗБОРАЎ

... Уважліва, з ледзь прыкметнай таямнічай усмешкай, глядзіць перад сабой маладая жанчына. Гэта А. Шарамецьева. Яе партрэт напісаны ў XVIII стагоддзі выдатным руснім мастаком Хв. Рокатавым. Палатно захоўваецца ў прыватным зборы. Цяпер яно выстаўлена ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР. Тут 22 снежня адкрылася выстаўка твораў рускага мастацтва з прыватных збораў Масквы і Ленінграда. Такая выстаўка праводзіцца ў Мінску ў другі раз. Яна дае магчымасць гледачам пазнаёміцца з вельмі рэдкімі або малавядомымі творамі рускага мастацтва.

Экспануюцца танія творы XVIII стагоддзя, як «Партрэт Пятра I» работы невядомага мастака, «Партрэт цэсарэвіча Канстанціна Паўлавіча», напісаны Д. Лявіцкім.

Багата прадстаўлены жывапіс XIX стагоддзя — партрэты работы А. Варнека («Жаночы партрэт»), І. Крамскога («Партрэт невядомай»), пейзажы М. Вараб'ёва («Алея ў Альбана»), Н. Чарняцова («Дар'яльская цясніна»), І. Айвазоўскага («Марына» і «Гара Арарат»), І. Шышкіна («Від у ваколіцах Дзюсельдорфа»), жанравыя работы А. Венецыянава («Сялянскія хлапчукі»), эцюд да малавядомай карціны П. Фядотава «Прыход палацавага грэнадэра Палацавай роты ў былую сваю роту Фінляндскага палка», работы Л. Саламатніна, Ф. Жураўлёва, В. Пярова, М. Ге.

Цікавыя палотны, створаныя на мяжы XIX—XX стагоддзяў. Гэта творы жывапісцаў І. Левітана, М. Фешына, Б. Кустадзіева, С. Нікіфарава, Л. Папова, Л. Пастарнака, Ю. Клевера, І. Грабара, Д. Бурлюка, З. Серабраковай, скульптараў А. Апякушына, П. Трубяцкога, С. Каненкава.

Значнае месца ў экспазіцыі займаюць творы мастакоў, якія нарадзіліся ў Беларусі: «Партрэт невядомай» работы С. Заранкі, «Партрэт маладога чалавека» работы К. Карсаліна, некалькі твораў К. Ясевіча, цудоўныя нацюрморты І. Хруцкага, пазітыўныя пейзажы В. Бялыніцкага-Бірулі і С. Жукоўскага.

Усяго на выстаўцы экспануецца каля дзвюхсот твораў. Гэта сапраўды хвалюючая сустрэча з руснім мастацтвам.

Р. БАДЗІН.

«НАРОДУ СВОЕМУ УСЛУГУЮ...»

ДА 425-ГОДДЗЯ З ЧАСУ НАРАДЖЭННЯ В. ЦЯПІНСКАГА

Васіль Мікалаевіч Амельяновіч-Цяпінскі (1540—1603) — адзін з самых прыкметных беларускіх культурных дзеячоў другой паловы XVI стагоддзя. Пратэстант па сваіх ідэйных перакананнях, ён з малаком маці ўвабраў лепшыя ідэалы заходнееўрапейскай цывілізацыі, народжанай эпохай Адраджэння, і ўсе свае мары і надзеі ўскладаў на гарадскую культуру, у якой бачыў гарантыю гістарычнай будучыні сваёй бацькаўшчыны. А бацькаўшчыну сваю ён уяўляў у арэоле цывілізацыі і суцэльнай асветы.

Паходзіў Васіль Цяпінскі з небагатай шляхецкай сям'і, што мела дробны маёнтак Цяпіна недалёка ад Лепеля. Год яго нараджэння і смерці вызначаны толькі прыблізна. Аднак дакладна ўстаноўлена, што ён быў сучаснікам Сымона Буднага, які меў вялікі ўплыў на фарміраванне яго светапогляду і ідэйных перакананняў. Яны былі аднадумцамі і часта сустракаліся на з'ездах «брацтваў» — спачатку кальвіністаў, а затым сацыніян. Аб іх блізкіх, сяброўскіх адносінах не раз гаварыў сам Будны. Ён часта бываў у Васіля Цяпінскага, называў яго «мілым братам», у яго доме неадночы выказваў свае філасофскія і палітычныя погляды. Як і аўтар вядомага «Катэхізіса», Васіль Цяпінскі спачатку прымыкаў да пратэстантаў, затым далучыўся да антытрынітараў, не падзяляючы, аднак, іх крайне левых палітычных поглядаў. Прытрымліваючыся ідэйных пазіцый Сымона Буднага, ён стаяў за прыватную феадальную ўласнасць на зямлю, прызнаючы, разам з тым, неабходнасць «справядлівых войнаў» для абароны нацыянальных інтарэсаў і гістарычнага лёсу народа.

Асветніцкія ідэалы Васіля Цяпінскага прыходзілі ў рэзкі антаганізм з феадальнай рэчаіснасцю. Пісьменніку і асветніку не заставалася нічога больш, як усе свае надзеі ўскладаць на асвету простых людзей і ў гэтым ілюзорным сродку бачыць панацэю ад сацыяльнага зла і палітычнай неўладкаванасці краю. Аднак яго найвялікшая заслуга ў тым, што ў тыя часы ліхалецця і зацятай ідэалагічнай барацьбы супраць польска-шляхецкай агрэсіі і прымусовага акаталічвання беларускага народа ён далучыў да патрыятычных сіл краю свой палемічны, поўны грамадзянскай мужнасці голас. Ён самааддана змагаўся за нацыянальную годнасць беларускага народа, абараняючы яго адвечную самабытную культуру, родную мову і яе багатае гістарычнае пісьменства ад ганьбавання і напасцяў каталіцкіх цемрашалаў.

Свае нацыянальныя думы і перадавыя ідэйныя перакананні В. Цяпінскі выказаў з уласцівай яму схільнасцю да афарыстычнага мыслення ў папулярнай ў тыя часы «Прадмове» да евангелля, у якой сцвярджае сваю прыналежнасць да «зацной монархіи словенской». Гэта была зусім незвычайная для тагачасных рэлігійных кніг прадмова, бо яна фактычна не мае нічога агульнага з рэлігіяй і больш за ўсё падобна на споведзь грамадзянскай веры перадавога нацыянальнага дзеяча, глыбока заклапочанага цяжкім сацыяльным становішчам свайго забітага цемрай і невуцтвам вялікага народа. Перад намі выдатны гістарычны твор беларускай публіцыстычнай думкі XVI стагоддзя і багаты чалавечы дакумент, літаратурна-пазнавальнае значэнне якога выходзіць далёка за межы сваёй эпохі. Пісьменнік не толькі раскрывае свой уласны светапогляд, свае палітычныя ідэалы. Ён дае, разам з тым, ідэалагічны аналіз эпохі і даносіць да нас сацыяльную псіхалогію, думкі і спадзяванні людзей тагачаснага грамадства.

Васіль Цяпінскі высока ўзнімае ў «Прадмове», фігуральна кажучы, нацыянальны сцяг беларусаў. Ён невыпадкова пачынае яе з «пацыянальнай веры». Ён кажа прыгожым стылем: «Радъ покажу мою веру», веру, «которую маю, а злаща народу своему рускому», які ён называе ад «даўных вякоў слаўным», бо яшчэ вялікімі продкамі яго ўпісаны на скрыжалях гісторыі незабыўныя подзвігі на палях бітваў і на ніве нацыянальнай культуры і асветы. І Васіль Цяпінскі імкнецца быць вартым сваіх выдатных продкаў, якія ўсе свае духоўныя сілы і матэрыяльныя магчымасці прыносілі на алтар народчага дабрабыту і працвітання бацькаўшчыны. «Тому я, — кажа ён, — з убогае своее маетности народу своему услугую». Пісьменнік быў бедным шляхціцам, але ў апошнія гады завёў уласную друкарню, каб бескарысліва сеяць сярод простых людзей добрае семя асветы і навукі «немыслимымъ або красомовнымъ выводомъ, не залецаными, ани часу угожаючими словы, але, яко сприязливый, простый а щирий, правдиве, вѣрне, а створисте зъ зычливости ку моей отчизне...» І няхай сабе ён не мае «высокай адукацыі», як тыя мітрапаліты, бо ён «не влохъ, не нѣменцъ, або не докторъ, ани якій поставленный межи попы», тым не менш будзе самааддана працаваць, як «русинъ, своей руси услугуючій». Ён рэзка папракае сваіх «адукаваных суайчыннікаў» за тое, што яны не дбаюць аб асвеце для простых людзей, «поневажъ которымъ бы то властней учинити пристоело: митрополитове, владыки и нихто з ученыхъ черезъ так многій часъ не хотѣлъ...». А тым часам ён, нягледзячы ні на што, наважыўся аддаць сябе цалкам «мілай айчыне і яе добрым людцам».

Так думаў пісьменнік, і думы яго вылiваліся ў абвінаваўчы акт супраць вінавайцаў духоўнага заняпаду краю. Ён, гэты акт, меў значную сацыяльную вартасць яшчэ і таму, што з яго лагічна вынікала цэлая асветніцкая праграма.

Пісьменнік быў глыбока заклапочаны гістарычным лёсам беларускага народа і ў сваёй грамадскай дзейнасці кіраваўся не столькі рэлігійнымі сімпатыямі, колькі гуманістычнымі перакананнямі агульнанацыянальнага значэння. Вельмі слушна, між іншым, адзначаў гэта М. Гарэцкі. Аўтар «Прадмовы», казаў ён, «ужо бачыць вялікую пагрозу развіццю свае нацыянальнае культуры, дзеля таго пытанні агульнанароднага значэння ставіць вышэй за пытанні ў справе рэлігійнай розніцы і служыць не толькі сваёй секце, а ўсяму народу, што для таго часу было запраўды неспадзяванаю праявай вялікае душы... Наогул уся яго праца была аддадзена роднаму люду, які волаў думкі Цяпінскага, раней быў «зацный слаўный, острій, достипный народъ», а за архірэямі ды панамі трапіў у цяжкае становішча цёмна люду».

А раней? — пытаецца сам у сябе В. Цяпінскі. І адказвае: раней, да шаленства езуіцка-уніяцкай зграі ў Беларусі «рускія вучоныя» былі вышэй «наученшихъ народов въ Либіи, въ Антиохіи, въ Пентаполии, Сыцылии, въ Месопотамии, въ Палестине, въ Финицыи инде». Сам рымскі папа не мог устаять перад іх вучонасцю, і слава аб «рускім розуме» ішла па ўсяму свету.

Не дзеля голай ісціны, зразумела, рабіў аўтар «Прадмовы» гэтыя даўгія экскурсы ў гісторыю старажытнарускай асветы і навукі. Яны спатрэбіліся яму для таго, каб будзіць «мелным звонам гістарычнай праўды» ўсіх тых, каго яшчэ можна было заклікаць да самаадданай патрыятычнай дзейнасці ў тых умовах прыкрай дэградацыі нацыянальнай беларускай культуры, якую публічна ганьбілі езуіцка-каталіцкія прыблуды і «свае», дамаслые рэнегаты і адшчапенцы.

Патрыятычная дзейнасць В. Цяпінскага мела дабратворны ўплыў на творчасць не толькі сучасных яму беларускіх пісьменнікаў, але і на фарміраванне ідэйных перакананняў наступных пакаленняў літаратараў, якія бачылі ў Цяпінскім узор бескарыслівага служэння радзіме і народу.

Сцяпан МАЙХРОВІЧ.

З нашай пошты

МОЖНА БЫЛО Б ПАПЯРЭДЗІЦЬ

У нашай раённай газеце «Агні камунізма» за 11 снежня гэтага года маю ўвагу прыцягнула «Літаратурная старонка». Прачытаў я там байку Г. Міхайлава «Бабёр-будаўнік» — і насцярожыўся: недзе гэтую байку чытаў раней. Стаў прыпамінаць — і ў другім нумары часопіса «Неман» за мінулы год знайшоў тое, што шукаў: байку «Бабёр-будаўнік». Толькі за подпісам... А. Лазнявога. Наш светлагорскі «байкапісец» «пазычыў» гэтую байку ў А. Лазнявога. Яго самастойнай творчай фантазіі хапіла толькі на тое, каб слова «сосед» памяняць на «хитрец», а заключны радок «А сколько их, любителей народного добра!»— на «Но придет же и на них когда-нибудь пора!..»

Вядома, непрыемна сустракацца з фактамі плагіяту. Але я хачу сказаць некалькі слоў пра тое, чаму гэты факт здарыўся менавіта на старонках нашай газеты.

Колькі часу назад пры рэдакцыі «Агнёў камунізма» было створана літаратурнае аб'яднанне. Кіраваў ім былы педагог І. Баравік, які добра ведаў літаратуру і па-сапраўднаму клапаціўся аб творчым росце начынаючых аўтараў. Члены літаб'яднання рэгулярна збіраліся на пасяджэнні, абмяркоўвалі напісаныя імі творы, рыхтавалі літаронкі. Але неўзабаве І. Баравік пакінуў рэдакцыю і пайшоў працаваць у школу. Літаб'яднанне распалася. Больш чым паўгода ў газеце не паяўлялася літаратурных старонак з творамі пачынаючых аўтараў. Аб тым, што літстаронкі ўсё ж трэба друкаваць, рэдакцыі напомнілі самі чытачы. І «Літаратурная старонка» паявілася ў газеце зноў. Але яе ніхто не абмяркоўваў, у яе трапіла ўсё тое, што самацёкам прыйшло ў рэдакцыю. Так, думаецца, трапіла туды і названая байка.

А калі б літаб'яднанне працавала, калі б творы для «Літаратурнай старонкі» абмяркоўвалі члены літаб'яднання, непрыемны выпадак можна было б папярэдзіць.

Л. БАЛДУЕЎ.

Светлагорск.

Выйшлі з друку

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Р. Барадулін. Красавік. Вершы. Для малодшага ўзросту. Мастак В. Ціхановіч. Тыраж 5 800 экз., стар. 40. Цана 24 кап.

І. Муравейка. Сем колераў вясёлкі. Вершы. Для малодшага ўзросту. Мастак А. Дэмарын. Тыраж 6 тыс. экз., стар. 32. Цана 23 кап.

К. Кірэенка. Урачыстая песня. Вершы. Для сярэдняга ўзросту. Мастак Г. Паплаўскі. Тыраж 5 800 экз., стар. 64. Цана 7 кап.

В. Говар. Завод заводаў. Кніга аб стварэнні электрастальнога чарадзея. На рускай мове. Для старэйшага ўзросту. Мастак В. Лашкевіч. Тыраж 7 500 экз., стар. 80. Цана 9 кап.

Дантэ Арфелі. Літнія. Раман. Пераклад з італьянскай мовы А. Шаўні. Мастак Я. Кулік. Тыраж 2 500 экз., стар. 292. Цана 51 кап.

С. Селіверстаў. Клятва на попелішчы. Раман. На рускай мове. Мастак Л. Асецкі. Тыраж 15 тыс. экз., стар. 280. Цана 50 кап.

В. Марозаў. У разведку ішоў хлопчык. Аповесць. На рускай мове. Для сярэдняга ўзросту. Малюнкі Ю. Пучынскага. Вокладка Г. Паплаўскага. Тыраж 50 тыс. экз., стар. 256. Цана 42 кап.

А. Авечнін. Ля Дзівосных гор. Аповесць. Для сярэдняга ўзросту. Малюнкі В. Каракіна. Тыраж 15 тыс. экз., стар. 160. Цана 30 кап.

Танцы. Зборнік танцаў для мастацкай самадзейнасці. Мастак І. Капелян. Тыраж 4 600 экз., стар. 104. Цана 27 кап.

НОВЫ ЧАСОПІС ПІСЬМЕННІКАЎ РАСІІ

Мікалай ШУНДЗІК,
галоўны рэдактар часопіса «Волга»

Нараджаецца часопіс «Волга»— орган Саюза пісьменнікаў РСФСР і яго Саратаўскага аддзялення — тоўсты, штомесячны, закліканы аб'яднаць літаратурныя сілы прыволжскіх абласцей і аўтаномных рэспублік. У рэдкалегію часопіса ўвайшло 19 чалавек, якія прадстаўляюць пісьменніцкія арганізацыі дзевяці гарадоў.

Першы нумар ужо здадзены ў вытворчасць. Мы хочам паднесці яго чытачам разам з навагоднімі віншаваннямі. У ім шырока прадстаўлены творчыя сілы Паволжа. Адкрываецца нумар вершамі аб Волзе Мікалая Благава, Фёдара Сухава, Андрэя Дзяменцьева, Сяргея Смірнова. Выступае таксама народны паэт Чувашыі Педэр Хузангай, народны паэт Мардовіі Эркай, паэты Татарыі і Башкірыі Файзулін і Муса Галі.

У раздзеле прозы — аповесць Грыгорыя Валодзіна «Чалавеку патрэбен лебедзь». Творчасць Валодзіна звязана з Астраханню, з Прыкаспіем.

Пад рубрыкай «З літаратурнай спадчыны» будзе апублікавана аповесць Усевалада Іванава «Апалавая стужка», якая нідзе яшчэ не друкавалася. У пачатку 60-х гадоў пісьменнік рыхтаваў зборнік «фантастычных» або, як ён часам называў іх, «таямнічых» апавяданняў і аповесцей. «Апалавая стужка» — з гэтага цыкла. Але ў ёй не проста фантастыка. Усевалад Іванаў пра гэта гаворыць так: «Для белетрыста таямніца — скарб. Але я хачу ісціны, а не таямніцы. Я хачу паказаць псіхалагічны стан сваіх герояў». Дзеянне аповесці адбываецца ў адным з волжскіх гарадоў. Паказаны савецкія людзі з іх невычэрпнай творчай энергіяй, уменнем глыбока любіць.

Наш карэспандэнт пабываў на радзіме Ул. І. Леніна ва Ульянаўску і гутарыў з першым сакратаром Ульянаўскага абкома партыі А. Скачылавым. У інтэрв'ю расказваецца пра сённяшняе і будучае горада, пра тое, як захоўваюцца памятныя мясціны, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Ільіча.

Аддзел крытыкі адкрываецца артыкулам маладога літаратуразнаўцы В. Смірнова «Аповесць у навелах і эвалюцыя нарыса». Пад рубрыкай «Гісторыя нашай літаратуры» друкуецца артыкул іванаўскага літаратуразнаўцы П. Купрыянаўскага «Гурток сапраўдных пралетарскіх паэтаў» і артыкул Л. Бязрукава «Новае аб Барысе Карніладе».

Ёсць у нас старонка для дзяцей, старонка тумару, ёсць і «Волжская мазаіка», якая расказвае аб цікавых фактах і людзях з мінулага і сённяшняга Волгі.

Партфель часопіса на будучы год даволі вялікі. Знаходзіцца ў рабоце аповесць В. Лебедзева «Валгар на чужыне» аб Горкім, аповесць Н. Скарцова «Чорная костка» аб удзеле інтэлігенцыі ў культурнай рэвалюцыі ў нашай краіне. Чакаем новы раман Мікалая Кочына «Ніжагародскі адхон», раманы аб вайне іншых відных пісьменнікаў-валжан Аляксандра Патрэева і Рыгора Канавалава. Заканчвае для часопіса навукова-фантастычны раман Вячаслаў Пальман. І ўсё ж пошукі новых літаратурных імён — для нас задача першаступенная. Мы згуртоўваем вакол часопіса маладых навелістаў, паэтаў, крытыкаў, студэнтаў, вучоных, служачых. Ужо здадзена ў набор аповесць «На мерыдыяне майго кахання» В. Кузьміна, гаркаўчаніна, маладога літаратара. Нас прывабіў галоўны герой гэтай аповесці — хлопец, які прыйшоў пасля дзесяцігодзі будаваць чыгунку. Аўтар пераканаўча паказвае, як узнікае глыбокая павага яго героя да рабочага чалавека.

Рэдкалегію захапляе думка апублікаваць мемуары Калантай. У нашым партфелі ёсць аповесць Героя Сацыялістычнай Працы, старшыні калгаса Кастрамской вобласці П. Малінінай «Волжскія ветры». У ёй з вялікай жыццёвай праўдай паказан складаны, зайздросны лёс аўтара, якая прайшла шлях ад простай сялянкі да члена ўрада.

Горкаўскі журналіст Аркадзь Чабатароў рыхтуе для нашага часопіса дакументальную аповесць «Падрэ Даратэо» — пра адважнага рускага чалавека, які змагаўся ў італьянскім руху Супраціўлення.

Сярод твораў аб воінскім подзвігу савецкага народа прыцягваюць увагу чытачоў запіскі генерал-палкоўніка І. Людникава «Бурныя гады». Аўтар камандаваў дывізіяй, якая ў саставе легендарнай 62-й арміі абараняла Сталінград.

У часопісе знойдуць месца творы і замежных літаратараў. Здаюцца ў набор два апавяданні прагрэсіўнага амерыканскага пісьменніка-фантаста Роберта Шэклі. Мы зацікавіліся аповесцю польскага пісьменніка Юзафа Макавецкага, якая вызначаецца антыфашысцкай накіраванасцю, напружаным сюжэтам, абаяльнымі, бясстрашнымі героямі.

«Волга» — часопіс усерасійскі, і таму мы будзем наладжваць творчыя сувязі з пісьменнікамі ўсёй Расіі. Ужо замацоўваюцца кантакты з многімі маскоўскімі пісьменнікамі і паэтамі, асабліва з тымі, чый лёс неаддзельны ад Волгі. Перш за ўсё трэба назваць К. Федзіна, Л. Собалева, К. Сіманава, А. А. Суркова, В. А. Смірнова, М. Аляксеева, Я. Смелякова, Д. Зорына, С. В. Смірнова, К. Гарбунова, Л. Ашаніна, С. Нараўчатава, М. Луконіна, Л. Касіля, а таксама ленінградцаў — В. Бергольц, С. Вароніна, М. Дудзіна.

Песні пра родны край, пра каханне, пра дружбу—такі рэпертуар салістки харавой капэлы Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна Лілі Ігнацьевай. Акампаніруе ёй студэнт Аляксандр Лабковіч.

Фота Э. ТРАГУБОВІЧА і В. МАНЬКО.

НАПІСАНА БЯСТУЖАЎКАМІ

«Гэта была зара вышэйшай жаночай адукацыі ў Расіі, і студэнткі вучыліся проста-такі з захапленнем—я не раз быў сведкам, як яны займаліся ў сценах свайго універсітэта (будынак курсаў на 10-й лініі Васільеўскага вострава)... Большасць імкнулася свядома і настойліва да адукацыі, вышэйшага багацця». Гэтымі радкамі з успамінаў вялікага рускага даследчыка прыроды Івана Сечанава адкрываецца зборнік «Санкт-Пецярбургскія вышэйшыя жаночыя (Бястужаўскія) курсы (1878—1918 гады)», які выйшаў у Ленінградзе.

Гэта жаночая вышэйшая навучальная ўстанова была заснавана гуртком прагрэсіўнай інтэлігенцыі. На курсах існавалі славесна-гістарычны і фізіка-матэматычны факультэты. На чале курсаў быў пастаўлен прафесар рускай гісторыі К. Н. Бястужаў-Румін (адсюль назва «Бястужаўскія»).

Кніга пра курсы створана на аснове архіўных матэрыялаў, а таксама часопісных, газетных артыкулаў і ўспамінаў былых бястужавак, многія з якіх—нашы сучасніцы.

На курсах у свой час вучыліся Надзежда Канстанцінаўна Крупская, Ганна Ільінічна і Вольга Ільінічна Ульянавы. Удзел у забастоўках, вобыскі, арышты былі звычайнай з'явай у асяроддзі бястужавак. У кнізе змешчаны партрэты і перадсмяротныя пісьмы пакараных смерцю курсістак.

Курсы, на якіх у іншыя гады навучалася амаль да 6 тысяч чалавек, далі краіне многа настаўнікаў, буйных навуковых работнікаў.

Зборнік выпушчан выдавецтвам Ленінградскага універсітэта, да якога пасля рэвалюцыі далучыліся Вышэйшыя жаночыя курсы. У гэтым жа гістарычным памяшканні на 10-й лініі Васільеўскага вострава, дзе яны некалі размяшчаліся, цяпер знаходзіцца матэматычна-механічны факультэт універсітэта.

Алена ДАРАШЭЎСКАЯ,
карэспандэнт АДН.

МУЛЬТЫПЛІКАЦЫЯ — МАСТАЦТВА ДУМКІ

Сучаснасць прад'явіла нечакана вялікі рахунак мультыплікацыі — мастацтву, якое за першыя дзесяцігоддзі сваёй гісторыі набыло даволі трывалую рэпутацыю «лёгкага жанру». Інерцыя гэтага пункту гледжання не пераадолена і па сённяшні дзень, хоць мультыплікацыя ўжо здолела даказаць, што, нягледзячы на абавязковую ўсмешку (спецыфіка жанру!), ёй пад сілу вельмі сур'ёзныя рэчы. «Мультыплікацыя перажывае сваё другое нараджэнне, — такая думка буйнага савецкага майстра Фёдара Савельевіча Хітрука. — Чыста відовішчны кінематограф стаў інтэлектуальным».

Так вызначыў рэжысёр у інтэрв'ю з карэспандэнтам ТАСС сутнасць змен, што адбыліся ў мультыплікацыі.

Падобны пункт гледжання падзяляюць буйнейшыя аўтарытэты ў свеце кіно. «Наша мастацтва стала вельмі складаным па думцы і па форме», — гаворыць вядомы югаслаўскі рэжысёр-мультыплікатар Ватраслаў Міміца. «Мультыплікацыя — мастацтва сапраўды неабмежаваных магчымасцей», — сцвярджае балгарын Тодар Дзічаў. Вядомы французскі мастак Жан Эфель лічыць, што працэсы, якія адбыліся ў мультыплікацыйным кіно пасля 1950 года, «можна параўнаць з сапраўднай рэвалюцыяй».

Здольнасць канкрэтызаваць абстрактныя паняцці адкрывае перад гэтым відам кінамастацтва, на думку Ф. Хітрука, перспектывы мастацтва вобразнай філасофіі. Мультыплікацыя — найкарацейшы шлях ад думкі да адлюстравання, зазначыў ён. Адсюль — яе магчымасці ў папулярызацыі складанейшых навуковых праблем. Ці ёсць у нас доследы ў гэтым плане? Так, ёсць. Нядаўна зроблены стужкі «На краю тайны» Л. Мільчына (аб пераўтварэнні мускульнай энергіі ў механічную) і «Добры дзень, атам!» Р. Давыдава, які расказвае пра будову атамнага ядра.

Але перш, чым такія фільмы стануць нормай, неабходна пераадолець мноства перашкод. Адной з іх рэжысёр лічыць тую акалічнасць, што «сапраўдныя крытэрыі яшчэ не ўстаноўлены». Адкрыўшы новыя межы свайго мастацтва, мастакі натрапілі на «залатую жылу». Магчымасці мультыплікацыі, тлумачыць сваю думку Ф. Хітрук, часта пераўзыходзяць магчымасці саміх майстроў. Каб паставіць карціну аб тэорыі адноснасці, што зусім рэальна на сучасным этапе мастацтва маляванага фільма, перш за ўсё неабходна самому разабрацца ў ёй...

Існуе пэўны разрыў, лічыць Хітрук, паміж патрэбамі гледача і тымі патрабаваннямі, якія прад'яўляюць мастакі самі сабе. Задача заключаецца ў тым, каб навучыць гледача разумець сучасную мову мультыплікацыі. Вось прыклад.

Амерыканскі майстар Джон Хаблі зрабіў карціну «Людзі і зоркі» — правіды энергіі. Ён знайшоў пластычную форму, каб перадаць на экране абстрактныя паняцці. Тым не менш папулярнасць гэтага вострa сучаснага мастака, падкрэслівае Хітрук, нават у яго на радзіме не ідзе ў параўнанне з папулярнасцю Дзіснея, які перажывае цяпер творчы крызіс. Як грамату ведаюць па буквару, так мультыплікацыю ведаюць па Дзіснею. З часоў 1938 года, з часу выхаду «Беласнежкі і сямі гномаў», зазначае рэжысёр, у свеце нічога не было зроблена роўнага па поспеху ў гледача. Мультыплікацыя ўсіх краін, рэзюміруе Хітрук, стаіць сёння перад праблемай заваявання гледача, які не вельмі ахвотна прызнае яе права на пастаноўку грамадска важных праблем.

У чым жа выйсце з гэтых супярэчнасцей і ў чым «сакрэт поспеху»?

— Мультыплікацыя павінна ставіць праблемы, якія хвалююць самае шырокае кола людзей,—адказвае Хітрук. — Мастацтва сацыялістычных краін дамаглося значных і агульнапрызнаных перамог на гэтым шляху.

Як вы сабе ўяўляеце асноўную задачу савецкага мультыплікацыйнага кіно?

— Вырашаць сучасныя праблемы сродкамі гратэску, мастацкай фантастыкі, сучаснай казкі. Тым больш, што гэтая форма — у традыцыях нашай мультыплікацыі. Яе «прабацькамі» былі палітычная сатыра і вокны РОСТа. Першым адрасатам быў дарослы глядач. Потым склалася так, што на працягу многіх гадоў «Саюзмультфільм» быў у асноўным студыяй дзіцячых фільмаў. «Дзіцячасць» тэматыкі сёння пераадолена, хоць адбітак інфантылізму адчуваецца да гэтай пары... Але такія стужкі, як «Лазня» С. Юткевіча і А. Карановіча, «Вялікія непрыемнасці» В. і З. Брумберг, «Хто сказаў «мяў»?» В. Дзегцярова, «Жыццё і пакуты Івана Сямёнава» В. Курчэўскага і Н. Серабракова, «Ляўша» І. Іванова-Вано настройваюць аптымістычна. (Было б несправядліва не дадаць да гэтых фільмаў стужкі самога Ф. Хітрука — «Гісторыя аднаго злачынства», «Таптыжка», «Канікулы Баніфацыя», якія атрымалі міжнароднае прызнанне).

Што, на ваш погляд, найбольш характэрна для савецкай школы мультыплікацыі?

— Яе жыццесцвярджальная, мажорная тэндэнцыя. Гэта заўсёды адзначаюць удзельнікі міжнародных фестываляў, як нашу вялікую заваёву, — адказвае рэжысёр.

Вашы творчыя планы?

— Я не люблю гаварыць пра свае задумы. Задумаў карціну пад умоўнай назваю «Чалавек у рамцы». Гэта павінен быць фільм пра бюракратызм, больш дакладна пра псіхалогію бюракратызму і яго паходжанне.

Чалавек і грамадства, іх узаемасувязі. Гэтую пазіцыю Хітрук лічыць ключавой для мастака. Гэту праграму ён паслядоўна рэалізуе ў сваіх карцінах.

Е. СЦІШОВА,
кар. ТАСС.

МАЙСТРЫ САВЕЦКАЙ СЦЭНЫ

ШЧОДРЫ ТАЛЕНТ

Кожны раз пасля выступленняў Гаар Гаспаран спрабуеш разабрацца, у чым сіла мастацтва гэтай таленавітай армянскай спявачкі, у чым яе абаяльнасць?

Складаная і шматгранная яе творчая натура. Майстэрства, мудрасць і прастата робяць мастацтва Гаар Гаспаран у вышэйшай ступені жыццесцвярджальным. Яно хвалюе, захапляе, перамагае.

Пачуўшы аднойчы спявачку, немагчыма не захапіцца чароўнасцю яе рэдкага па прыгажосці і тэмбру голасу. Кожная сустрэча з ёй і ў канцэрце і на опернай сцэне выклікаюць упэўненасць, што вы з'яўляецеся сведкам з'явы вялікай, выключнай.

Музычны крытык адной з замежных газет пісаў: «Гаар Гаспаран належыць да таго рэдкага тыпу каларатурных сапрана, які, як мы думалі, ужо вымірае і прадстаўнікамі якога былі такія спявачкі, як Галі Курчы і Лілі Понс».

Для Гаар Гаспаран не існуе вакальных цяжкасцей. Рэпертуар яе не абмежаваны эпохай, краінай або кампазітарам. Ей у роўнай ступені даюцца творы класічныя і сучасныя, каларатурныя і драматычныя, манументальныя палотны і аварэльныя мініяцюры.

Адзін са слухачоў параўнаў гучанне голасу Гаспаран з неперапраўзыдзенымі па прыгажосці тэмбру італьянскімі скрыпкамі лепшых майстроў. Спявачка рэгістры свайго шырокага дыяпазону расквечвае то ў мяккія, цёплыя, пяшчотныя таны, то афарбоўвае іх у светлыя, радасныя колеры, то надае ім празрыста-крышталёвыя або густыя адценні.

Высокі прафесіяналізм, мастацкая культура Гаспаран адчуваюцца ва ўсім—у стылістычнай дакладнасці выканання, у артыстычнасці, у падборы рэпертуару.

Слава, вядомасць Гаар Гаспаран далёка выйшла за межы СССР. Ёй з захапленнем апладзіравалі слухачы Венгрыі, Польшчы, Румыніі, Японіі, Фінляндыі, Ірана, Аб'яднанай Арабскай Рэспублікі, Лівана...

Дзіцячыя і вучнёўскія гады Гаар Гаспаран прайшлі ў Каіры. Там яна пад кіраўніцтвам вопытнага педагога пачала ўдасканальваць свой голас. З вяртаннем у Савецкі Саюз, у родную Арменію, яна набыла не толькі радзіму, але і атрымала магчымасць яшчэ больш удасканальваць сваё майстэрства.

Здзіўляючая памяць, хуткае і правільнае ўспрыманне стылю і формы выконваемага дазволілі Гаар Гаспаран у першыя ж гады самастойнай работы ў Арменіі ахапіць мноства вакальных вобразаў. Сціплы спачатку рэпертуар стаў хутка—ад выступлення да выступлення — узбагачацца, расці. Канцэртныя праграмы спявачкі вельмі рознабаковыя. У адных гучаць армянская народная песня, творы Камітаса, Емяляна, Чухаджана, Тэр-Гевандзяна, Ашота Сацяна, Аляксандра Аруцюняна, Эдварда Мірзаяна. У другіх — творы Баха, Гендэля, Бетховена, Моцарта, Гуно, Вердзі, Меербера, Беліні. Гаспаран вывучыла і палюбіла таксама рускую мову. Аляк'еў і Глінка, Рымскі-Корсакаў і Кюі, Чайкоўскі і Рахманінаў, Гліэр трывала ўвайшлі ў рэпертуар спявачкі.

У рабоце Гаспаран над рэпертуарам і яго апрацоўкай вялікую ролю адыграла яе нязменны памочнік і акампаніятар — Элеанора Васканян. Тонкі музыкант, Элеанора Васканян ужо больш як дзесяць год падзяляе з Гаар Гаспаран будні працы і спадарожнічае яе поспеху на эстрадзе.

Асаблівае месца ў рэпертуары артысткі займае праграма, падрыхтаваная да 400-гадовага юбілею з дня нараджэння Шэкспіра. Гэта першы тэматычны канцэрт, складзены з вялікага па аб'ёму музычнага матэрыялу, напісанага на тэксты Шэкспіра. Перад слухачамі паўстае цэлая галерэя вобразаў, створаных геніем Шэкспіра. Бляск і свабода інтэрпрэтацыі пры выкананні гэтага цыкла спалучаюцца з яркім талентам артысткі, якая валодае багаццем пераўвасаблення. Тут арыі Форд-Нікалаі і песня Дэздэмоны — Вердзі, вальс Джульеты—Гуно, арыя лэдзі Макбет—Вердзі. Побач са светлымі, лёгкімі і простымі вонкава сціплымі, але даволі складанымі санетамі гучаць разгорнутыя сцэны з опер — падобна сцэне вар'яцтва Афеліі з оперы Тома «Гамлет».

Часта выканаўцу лічаць выдатным толькі за некаторыя асобныя якасці — за высокую тэхніку, глыбіню і тонкасць у прачытанні таго або іншага вобраза, за багацце і разнастайнасць рэпертуару. Гаспаран валодае не толькі вышэй упамянутымі, але і многімі іншымі якасцямі, з якіх асабліва каштоўна яшчэ адна—валоданне мастацтвам «бельканта», амаль страчаным у нашы дні.

Вяршыняй творчага майстэрства спявачкі з'явілася сцэнічнае ўвасабленне вобраза Лючыі дзі Ламермур у оперы Даніцэці. Гэтая роля як бы завяршае цэлую галерэю створаных Гаспаран на опернай сцэне жаночых вобразаў: Ануш, Алімпіі, Віялеты, Лакмэ, Дэздэмоны, Разіны, Джульеты і многіх іншых. Гібка і гарманічна ад сцэны к сцэне, ад дзеяння да дзеяння, развівае Гаспаран вобраз Лючыі, які дзякуючы яе тонкай інтэрпрэтацыі ўспрымаецца скульптурна выразным, сагрэтым цеплынёй і чалавечнасцю.

Анаіт ЦЫЦЫКЯН,
(АДН).

МУЗЕЙ ПАШЫРАЕЦЦА

Сотні цікавых экспанатаў дэманструецца ў залах Крычаўскага краязнаўчага музея. Тут рэдкія выданні кніг, дакументы, якія расказваюць аб етанаўлені Савецкай улады на Крычаўшчыне, стэнды аб гераічнай барацьбе землякоў на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

Цяпер краязнаўчы музей пашыраецца. У ім ствараецца аддзел роднай прыроды. Новым аддзелам загадвае на грамадскіх асновах дырэктар Чэрыкаўскага лясгаса В. Шаблоўскі.

«РЫГА»—ТРЫ ПРАГРАМЫ

Хатні рэпрадуктар уключаны ў звычайную разетку радыёсеткі. Але што гэта? Побач з рэгулятарам гучнасці ў яго нейкі дадатковы рычажок. Адзін паварот гэтага пераключальніка —і апошнія паведамленні ўжо гучаць на нацыянальнай мове, яшчэ паварот — і паліліся велічныя гукі класічнай музыкі. Гучнагаварыцель «прымае» тры праграмы? Так.

Новы рэпрадуктар РТВ-64 «Рыга», які дэманструецца на ВДНГ СССР, распрацаваны групай работнікаў Рыжскага радыётрансляцыйнага вузла. Яго больш дакладна можна было б назваць прыёмнікам: ён прызначаны для прыёму праграм гарадскіх радыётрансляцыйных сетак, на якіх ужо вядзецца шматпраграмнае радыёвяшчанне. Дзве дадатковыя праграмы, якія перадаюцца на другіх частотах па тых жа правадах, ажыццяўляюцца «Рыгай» дзякуючы выкарыстанню ў схеме паўправадніковых прыбораў—двух германіевых дыёдаў і чатырох транзістараў.

Трохпраграмны гучнагаварыцель падключаецца адначасова і ў электрасетку, ад якой спажывае невялікую дадатковую магутнасць пры пераключэнні на II і III праграмы. Сумесна са звычайным аднапраграмным рэпрадуктарам новы гучнагаварыцель можа быць выкарыстаны для праслухоўвання і стэрыяфанічных перадач. Спецыяльныя гнёзды дазваляюць падключаць да яго магнітафон для запісу любой з праграм.

ТАСС.

«РУСАРЫ» Ў КІНЕМАТОГРАФЕ

Аб'ектывы маркі «Русар» добра вядомы і прафесіяналам і фотааматарам. Яны названы па прозвішчу кіраўніка праблемнай лабараторыі Ленінградскага інстытута дакладнай механікі і оптыкі Міхаіла Русінава.

Сямейства «Русараў», якія нарадзіліся ў лабараторыі, даўно пераваліла за сотню. Аб'ектывы выкарыстоўваюцца ў навуковых даследаваннях, яны—нязменныя спадарожнікі спартсменаў-аквалангістаў. Але, бадай, самая цесная творчая дружба звязвае супрацоўнікаў лабараторыі з работнікамі кінематаграфіі, асабліва пасля з'яўлення шырокафарматнага кіно.

«Эфектам прысутнічання «гледача» на экране кінематаграфісты ў першую чаргу абавязаны аб'ектыву «Русар-8». Яго аптычныя характарыстыкі прыстасаваны да шырокага экрана. Возьмем, напрыклад, вугал поля зроку. Чым ён больш, тым большая плошча паказу, больш рэзка мяняецца перспектыва. У аб'ектыве «Русар-8» гэты вугал складае 130 градусаў. Гэта больш таго, на што здольна чалавечае вока.

А цяпер перанясёмся ў тую галіну тэхнікі кінематаграфіі, дзе немагчымае робіцца рэальным—у галіну трукавога кіно. Метад, распрацаваны яшчэ да вайны савецкім аператарам Барысам Гарбачовым, заключаецца ў аб'яднанні ў адным кадры акцёраў і асобна зазнятага фону або макета дэкарацыі. Тут кадр здымаецца адначасова на дзве плёнкі: на звычайную, якая ўспрымае бачныя праменні, і на адчувальную да нябачных інфрачырвоных праменняў.

АДН.

Куток калекцыянера

ГІСТОРЫЯ АЙЧЫННАЙ ПОШТЫ

«Гісторыя айчыннай пошты» — так называецца серыя з чатырох марак, выпушчаных Міністэрствам сувязі СССР. Руская пошта ўяўляецца адной са старэйшых у Еўропе. Зарадзіўшыся яшчэ ў XIII стагоддзі, калі конныя ганцы завозілі з аднаго горада ў другі граматы, загады, данясенні, пісьмы, яна стала дзяржаўнай поштай у пачатку XVIII стагоддзя (пры Пятры Першым).

Серыя адкрываецца маркай, на якой намаляваны конны і пешы ганцы XVI стагоддзя. Конны ганец трушчыць у ражок абвяшчаючы сваё прыбыццё. На другім плане ўмоўныя адлюстраванні старажытнарускіх гарадоў Ноўгарада і Пскова, паміж якімі дзейнічала рэгулярная паштовая сувязь. Марка выканана ў спалучэнні зялёнага, шэрага і карычневага колераў. Яе намінал — 1 капейка.

На другой марцы — паштовая тройка. Вышэй яе дадзены контуры паштовага тракту, які злучае Маскву і Рыгу, намаляваны старадаўні компас. Пад тройкай — маленькі малюнак старажытнарускай карэты-калымагі і надпіс: «Паштовыя перавозкі XVII—XVIII стагоддзяў». Кошт гэтай маркі, выкананай у шэрым, жоўтым і карычневым танах, таксама 1 капейка.

Пошце першых гадоў Савецкай улады прысвечана трэцяя марка гэтай серыі. У той час для таго, каб наблізіць паштовыя ўстановы да насельніцтва, былі створаны так званыя «перасоўныя пошты». Выклікана гэтая мера была тым, што ад старой Расіі Рэспубліцы Саветаў дасталася вельмі абмежаваная колькасць прадпрыемстваў сувязі, да таго ж размешчаных зусім нераўнамерна. Многія населеныя пункты краіны знаходзіліся ад паштовых кантор на адлегласці ста і больш кіламетраў. «Перасоўныя пошты» на аўтамашынах (адна з якіх паказана на малюнку) развозілі карэспандэнцыю і прымалі ў асобных населеных пунктах пісьмы, пасылкі. На марцы намаляваны таксама самалёт першай унутранай авіялініі Масква—Ніжні Ноўгарад (цяпер Горкі), адкрытай у 1923 годзе, і конная кібітка, якой карысталіся ў той час для паштовых перавозак побач з аўтамабілем і самалётам. Гэтая марка, выкананая ў спалучэнні чорнага, фіялетавага і карычневага колераў, мае намінал у 4 капейкі.

Апошняя—чацвёртая марка серыі «Гісторыя айчыннай пошты» паказвае сённяшні дзень савецкай паштовай сувязі. На ёй адлюстраваны аператар ля пульта машыннага кіравання апрацоўкі карэспандэнцый, канвеерная ўстаноўка для сарціроўкі пасылак, будынак паштамта, на дах якога садзіцца верталёт. Пад малюнкамі надпіс: «Механізацыя і аўтаматызацыя апрацоўкі пошты». Марка выкананa ў блакітных і карычневых танах. Намінал яе—12 капеек.

Усе чатыры маркі маюць агульнае серыйнае афармленне. Іх памеры — 32,5 на 47,5 міліметра. Друк глыбокі. Зубцоўка — грабенчатая. Арнамент картуша дадзены рэльефным цісненнем. Аўтарам малюнкаў з'яўляецца мастак Васіль Заўялаў.

Марыя КАВАЛЁВА.
(АДН).

У класе балетнай студыі Гродзенскага Палаца культуры тэкстыльшчыкаў ёсць і зусім маленькія артысты. Ім па 6 і 7 гадоў. Пройдзе час і можа стацца, што некаторыя з іх будуць выступаць на вялікай сцэне. А пакуль што яны пад кіраўніцтвам выкладчыцы Валянціны Мікалаеўны Лобач з вялікай ахвотай рыхтуюць канцэртную праграму, якую паказваюць на навагоднім вечары.

Фота М. МІНКОВІЧА.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ЗА РУБЯЖОМ

ЗАМАК ПРЫНЦА ДАЦКАГА

Аўтастрада, па якой імчацца на вар'яцкай хуткасці аўтамабілі, ідзе ўсё далей і далей ад Капенгагена на поўнач вострава Зеландыя... Там, у 42 кіламетрах ад дацкай сталіцы, праліў Эрэзунд сціскаецца да трохчатырох кіламетраў, і ў добрае надвор'е можна простым вокам убачыць вонкі данмоў, што стаяць на процілеглым шведскім беразе.

Эрэзунд — гэта пачатак зоны праліваў, якая злучае Балтыйскае мора з Атлантычным акіянам. Тут заўсёды пануе ажыўленне.

У самым вузкім месцы праліва размешчаны адзін са старажытнейшых гарадоў Даніі Хельсінгер. Горад невялікі — усяго каля 20 тысяч жыхароў. У ім шмат старых дамоў, якім больш за 300 гадоў. Захаваліся вуліцы настолькі вузкія, што па іх можна праехаць толькі ў адным напрамку. Яшчэ не дазджаючы да горада, з аўтастрады бачым прыгожы від на вялізны шэры палац — крэпасць з высокімі вострымі вежамі і светла-зялёным дахам. Палац стаіць асобна, на самым беразе, і нібы «крыкрывае Хельсінгер ад небяспекі, што пагражае яму з мора. Гэта — Кронбарг, замак, у якім, паводле старажытнага падання, жыў Гамлет. Кронбарг азначае ў перакладзе «Крэпасць кароны». Цікава, што Шэкспір у сваёй неўміручай трагедыі назваў замак па імю горада Хельсінгер.

Крэпасць была закладзена ў сярэдзіне XV стагоддзя, каб збіраць пошліну з караблёў, якія праходзяць пралівам. Яе гарматы свабодна прастрэльвалі Эрэзунд аж да шведскага берагу, і дрэнна было таму караблю, капітан якога спрабаваў праскочыць міма, не ўнёсшы пэўную плату дацкаму каралю. Жэрлы гэтых гармат і цяпер пагражальна тырчаць над крапасным валам, а каля іх па традыцыі ходзіць вартавы. На працягу стагоддзяў Кронбарг неаднаразова перабудоўвалі. З часам мянялася і яго прызначэнне. Страціўшы значэнне крэпасці, Кронбарг пачаў выкарыстоўвацца як турма і засценак для ўсіх, хто няўгодны ўладам. Вонкавае аблічча замка, пабудаванага ў формс квадрата з рознай вышыні вежамі па вуглах і наменным дворыкам пасярэдзіне, робіць уражанне стройнасці і прыгажосці, аднак, калі спуснаешся ўніз і ідзеш па яго незлічоных змрочных падземных пераходах, падвалах і казематах з таўстымі сценамі і нізкімі скляпеннямі, пачынаеш разумець абстаноўку жорсткасці, бяспраўнасці і прымусу, якую адчувалі тут тысячы імянітых і безымянных вязняў.

З Кронбаргам звязаны розныя народныя легенды. Адна з іх расказвае, што ў падзямеллі замка спіць воін-волат, нацыянальны герой Даніі Хольгер Данске. Ён прачынаецца, калі краіне пагражае небяспека, і ўзначальвае барацьбу за яе вызваленне ад ворагаў. Гэтая легенда была асабліва папулярная ў народзе ў гады фашысцкай акупацыі. Буйнейшы атрад барацьбітоў руху Супраціўлення насіў тады імя гэтага волата.

Цяпер Кронбарг з'яўляецца музеем. Імя Гамлета прыцягвае многіх турыстаў і на ім тут нядрэнна зарабляюць. Замак добра захаваўся і яшчэ доўга прастаіць на віду караблёў, якія праплываюць міма яго, выклікаючы ў людзей добрыя ўспаміны пра аднаго з любімых герояў Шэкспіра — Гамлета — прынца дацкага.

Ю. КІСЯЛЁЎ,
карэспандэнт ТАСС.
Капенгаген.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

24 снежня

Першая праграма. 11.00 — «Чорны бізнес». Мастацкі фільм. 14.55 — праграма перадач. 15.00 — першынство СССР па цяжкай атлетыцы. 16.20 — для малышоў. «Шустрык і Мямлік падарожнічаюць». 17.00 — тэлевізійныя навіны. 17.20 — «Дарогай героя». Дакументальны фільм Беларускага тэлебачання. 17.50 — рашэнні верасняўскага Пленума ЦК КПСС — у жыццё. «У новых міністэрствах». Расказ аб Міністэрстве мясцовай прамысловасці. 18.10 — «Мастацтва Беларусі». Кіначасопіс. Выпуск, прысвечаны Беларускаму радыё. 18.20 — школьная фільматэка. М. Горкі. «На дне». Фільм-спектакль. 1-я і 2-я серыі. 21.00 — канцэрт, прысвечаны 40-годдзю Беларускага радыё і 10-годдзю Беларускага тэлебачання.

Другая праграма. 12.00 — тэлевізійныя навіны (М). 12.15 — канцэрт мастацкай самадзейнасці працоўных рэзерваў Свярдлоўска (М). 17.00 — для школьнікаў. «Гном» (М). 17.40 — «Из искры возгорится пламя». Да 65-годдзя выхаду першага нумара газеты «Искра» (М). 18.10 — тэлевізійныя навіны (М). 18.30 — «Рыцары мяча і шчыта» (М). 19.00 — бр. Тур. «Уцёкі з начы». Спектакль Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Ул. Маякоўскага (М). У перапынках — тэлевізійныя навіны (М). 22.30 — вынікі спартыўнага года (М).

25 снежня

Першая праграма. 11.00 — праграма Сахалінскай студыі тэлебачання. Прамая трансляцыя з Уладзівастока праз спадарожнік «Маланка-1» (М). «Вострaў Шыкатан». «Адгукніся, таварыш». Тэленарысы. «Лондан—Сахалін». Кінанарыс. 14.55 — праграма перадач. 15.00 — С. Пракоф'еў. «Любоў да трох апельсінаў». Перадача з Ленінграда. У перапынках — тэлевізійныя навіны (М). 17.30 — для дзяцей. «Новыя прыгоды Бураціна». 18.10 тэлевізійныя навіны. 18.30 — «Максім Перапяліца». Мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі. «Ленфільм». 20.00 — тэлевізійны клуб кінападарожнікаў (М). 21.00 — тэлевізійныя навіны (М). 21.20 — першынство СССР па цяжкай атлетыцы. Трансляцыя на Маскву. 22.00 — эстрадная праграма. Перадача са Свярдлоўска.

Другая праграма. 17.30 «Веды». Навукова-пазнавальная праграма» (М) 18.20 — канцэрт. Перадача з Львова. 20.00 — першынство СССР па цяжкай атлетыцы Трансляцыя на Маскву. 21.20 — «Іскожкамбінат». Кінанарыс. 21.30 — «Васіль Дакучаеў». Навукова-папулярны фільм. 22.30—канцэрт заслужанай харавой капэлы Украінскай ССР «Трембіта».

26 снежня

Першая праграма. 10.00 — «Будзільнік» (М). 10.30 — мультыплікацыйныя фільмы. (М). 11.00 — «Маскоўскі Крэмль учора і сёння» (М). 11.30 — для дзяцей. «Як самому зрабіць ёлачныя цацкі». 12.00 — для школьнікаў. «Рабяты з Какнерскага». Мастацкі фільм. 13.15 — «Квартэт вясёлых рабят». Фільм-канцэрт. 13.30 — сельскі клуб «Колас». У нас у гасцях паляўнічыя і рыбаловы. Трансляцыя на Маскву. 14.20 — «Дзекабрысты». Да 140-годдзя з дня паўстання. Перадача з Ленінграда. 15.10 — «Музычны кіёск» (М). 15.30 — «Пеленгатар» № 3 (М). 16.10 — для дзяцей. «Харэаграфічны лейдаскоп». Выступленне харэаграфічнай групы дзіцячага сектара Мінскага Палаца прафсаюзаў. 16.40 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Лічыце мяне жывым». Кінанарыс. 16.55 — «Год выдання — 1965». Навінкі беларускай мастацкай літаратуры. 17.35 — «Герой Маандзаунда». Кінанарыс Гомельскай студы